ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧАЦВЕР, 6 КАСТРЫЧНІКА 1938 г. № 55 (397)

ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

Напярэдадні 21-й гадавіны Кастрычніка

Набліжаюцца знамянальныя гістарычныя даты—дваццацігадовы юбілей ленінска-сталінскага комсамола і дваццаць першая гадавіна Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

З натхненнем рыхтуецца наша радзіма да гэтых урачыстых дзён.

Дваццацігоддзе ленінска-сталінскага комсамола — радаснае свята ўсяго совецкага народа. Верны сын партыі Леніна—Сталіна — комсамол заўсёды быў і застаецца надзейным памочнікам партыі, рэзервам яе, арганізатарам комуністычнага выхавання моладзі.

Ленінска-сталінскі комсамол гераічна і мужна змагаўся на франтах грамадзянскай вайны. Стаханаўскай працай на франтах соцыялістычных пяцігодак, гераізмам і майстэрствам сваім услаўлялі і ўслаўляюць радзіму маладыя сыны і дочкі яе—комсамольцы і комсамолкі. Баявым ордэнам Чырвонага Сцягу і ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцягу ўзнагароджан комсамол за выключныя заслугі перад радзімай.

20-гадовы юбілей ВЛКСМ святкуе совецкі народ напярэдадні 21-й гадавіны Вялікага Кастрычніка.

Завяршаецца 21-ы год соцыялістычнага будаўніцтва—год трэцяй сталінскай пяцігодкі, які новыя перамогі соцыялізма ўпісаў у гісторыю нашай радзімы.

21-ю гадавіну Вялікага Кастрычніка совецкі народ сустракае сталёвай згуртаванасцю вакол партыі Леніна—Сталіна. Пад кіраўніцтвам партыі разгромлены гнёзды трацкісцка-бухарынскай, нацыянал-фашысцкай зграі шпіёнаў і дыверсантаў—наймітаў фашысцкіх разведак. Пад кіраўніцтвам партыі, совецкі народ пераможна крочыць па шляху соцыялізма. Пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі квітнее свяшчэнная совецкая зямля—вялікі саюз народаў адзінаццаці братніх рэспублік.

21-ю гадавіну Вялікага Кастрычніка сустракае радзіма ўмацаваннем баявой, абароннай магутнасці «каб ніякая «выпадковасць» і ніякія фокусы нашых знешніх ворагаў не маглі засцігнуць нас знянацку...» (Сталін).

Фашысцкія агрэсары разрываюць зараз Чэхаславацкую дзяржаву; небяспека вайны ўзрасла, як ніколі. Над усім светам згусціліся свінцовыя хмары крывавай навальніцы — сусветнай вайны.

У гэтай накалённай атмасферы, складанай міжнароднай абстаноўцы спакойна і горда сустракае совецкі народ сваё радаснае свята новымі поспехамі соцыялістычнай працы, новым творчым уздымам. Разгорнута перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва паміж заводамі, паміж калгасамі. Новымі творчымі поспехамі павінны сустрэць надыходзячыя ўрачыстыя дні і работнікі мастацтва, работнікі літаратуры.

Абавязак совецкіх пісьменнікаў, майстроў соцыялістычнага мастацтва рыхтаваць творчыя падарункі маці-радзіме з такім-жа запалам, энергіяй, натхненнем, як рыхтуюць новыя вытворчыя рэкорды нашы стаханаўцы.

Так працаваць заклікаў пісьменнікаў вялікі паэт совецкага народа Уладзімір Маякоўскі:

«Я хочу,
чтоб к штыку
приравняли перо
С чугуном чтоб
и с выделкой стали
О работе стихов
от Политбюро
чтобы делал
доклады Сталин».

Трэба дасягнуць таго, каб у юбілейныя дні ВЛКСМ, у дні XXI гадавіны Кастрычніка, дасягненні мастацтва і літаратуры сталі поруч з рэкордамі сталевараў, з рэкордамі нашых стаханаўцаў. Гэтымі дасягненнямі павінны быць творы аб сонечных днях соцыялізма, аб нашым вялікім совецкім народзе, аб пільных пагранічніках, аб магутнай Чырвонай Арміі. Гэтым вялікім перадкастрычніцкім дасягненнем павінен з'явіцца паварот нашых пісьменнікаў да сучаснай тэматыкі, да

паказу жыцця квітнеючай прымежнай Совецкай Беларусі.

На заклік комсамольцаў аўтазавода імя Сталіна сустрэць 20-годдзе ВЛКСМ падарункамі маці-радзіме адгукнуліся комсамольцы-пісьменнікі. Група паэтаў напісала калектыўную работу пра комсамол. Падрыхтаван спецыяльны зборнік твораў маладых аўтараў, прысвечаны юбілею. Але Саюз совецкіх пісьменнікаў не падышоў сур'ёзна да такой ганаровай і адказнай справы, як падрыхтоўка юбілейнага зборніка. Многія пісьменнікі не выканалі ўзятага абавязку — не здалі твораў. А маладым аўтарам, напісаўшым творы да юбілею, Саюз не аказаў патрэбнай творчай дапамогі, што магло-б забяспечыць больш высокую мастацкую вартасць твораў. Зараз узнікае яшчэ небяспека, што гэты падарунак не атрымае наша моладзь у юбілейныя дні, бо зборнік яшчэ не здан у вытворчасць і Выдавецтва БССР не гарантуе выданне яго нават да канца года. Зрыў выдання зборніка—недапушчальны. Творы, прысвечаныя юбілею, павінны быць выданы і своечасова да дзён юбілею. Забяспечыць гэта— абавязак ЦК ЛКСМБ, Дзяржаўнага Выдавецтва БССР.

Мінулы год—юбілейны кастрычніцкі год—узбагаціў наша мастацтва радам новых каштоўных твораў. Але вопыт падрыхтоўкі да 20-гадовага юбілею Кастрычніка не быў замацаваны і не выкарыстаны зараз — напярэдадні 20-гадовага юбілею ВЛКСМ і 21-й гадавіны Кастрычніка. Нават не разгорнута належным чынам соцыялістычнае спаборніцтва між тэатрамі, мастацкімі калектывамі на лепшую падрыхтоўку да ўрачыстых дзён.

Пачэсную і адказную задачу да 21-й гадавіны Кастрычніка вырашае Дзяржаўны Віцебскі тэатр—рыхтуе спектакль «Чалавек з ружжом», у якім упершыню на беларускай сцэне будзе паказан вобраз вялікага генія рэволюцыі В. І. Леніна. П'есу беларускага драматурга Клімковіча «Кацярына Жарнасек» рыхтуе да свята Белдзярждрамтэатр. Першую беларускую оперу «Міхась Падгорны» пакажа ў канцэртным выкананні Тэатр оперы і балета. Але здзіўляе тое, што толькі Дзяржаўны Яўрэйскі тэатр не падрыхтаваў ніякай новай работы да слаўнага юбілею ВЛКСМ, да 21-й гадавіны Кастрычніка.

Плённа працуюць кампазітары. Імі напісаны да ўрачыстых дзён песні, новыя музычныя творы. Беларускія мастакі прымаюць удзел у выстаўцы, прысвечанай 20-годдзю ВЛКСМ, у Маскве.

На дасягнутым спыняцца нельга. Дні падрыхтоўкі да юбілею ВЛКСМ і 21-й гадавіны Кастрычніка павінны быць днямі напружанай творчай работы, днямі ўзбагачэння нашага мастацтва творамі высокага ідэйнага ўзроўню, вялікай мастацкай вартасці. Справа гонару пісьменнікаў, работнікаў мастацтва працаваць з такім уздымам і запалам, каб паказаць працоўным нашай краіны ў дні святкавання лепшыя ўзоры сваёй творчай работы.

21 год пераможна крочыць вялікі совецкі народ пад сцягамі большэвіцкай партыі па шляху Леніна — Сталіна—да комунізма.

І ў дні 20-гадовага юбілею ВЛКСМ наша сталінская моладзь, ленінска-сталінскі комсамол з новай сілай прадэманструюць любоў і адданасць да нашай маці-радзімы, да партыі Леніна—Сталіна.

У дні 21-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі наш совецкі народ, з'яднаны вакол партыі Леніна—Сталіна, вялікага правадыра народаў—таварыша Сталіна, прадэманструе сваю абаронную магутнасць, гатоўнасць у кожны момант стаць на абарону свяшчэннай зямлі сваёй радзімы, бязмежную адданасць справе Леніна—Сталіна, комунізму.

Указ

ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР АБ УЗНАГАРОДЗЕ КАМПАЗІТАРА ПАКРАС Д. Я. ОРДЭНАМ ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА.

За заслугі ў справе стварэння рада баявых совецкіх песень, стаўшых здабыткам шырокіх мас народа, узнагародзіць кампазітара ПАКРАС Дзмітрыя Якаўлевіча ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

НАМЕСНІК СТАРШЫНІ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР
Г. ПЕТРОЎСКІ.

САКРАТАР ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР
А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль, 1 кастрычніка 1938 г.

САМАЛЁТ „РОДИНА“ ЗНОЙДЗЕН!

ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ САМАЛЁЦЕ „РОДИНА“

3 кастрычніка 1938 года звяно гідрасамалётаў Грамадзянскага паветранага флота вылецела з Комсамольска на пошукі самалёта «Родина» у раён возера Эверон—возера Амуткіт—населены пункт Кербі, знаходзячыся ў 125—200 клм на паўночны захад ад г. Комсамольска.

У 13 гадзін 30 мінут (па мясцоваму часу) лётчык Сахараў заўважыў самалёт на зямлі ў 20 клм на паўднёвы захад ад возера Амуткіт. Знізіўшыся да вышыні 10 метраў, ён ясна ўбачыў двухматорны самалёт і двух чалавек каля самалёта, падаваўшых сігналы белым палотнішчам. Праз 5 мінут прыляцеў другі самалёт пад упраўленнем лётчыка Бурлакова і праз гадзіну — трэці, пад упраўленнем лётчыка Раманава, якія таксама бачылі самалёт двухматорны і двух чалавек каля самалёта.

---

4 кастрычніка няспынна падтрымлівалася сувязь па прамому проваду паміж Масквой і Комсамольскам-на-Амуры.

У 1 гадзіну 35 мінут у Маскве было атрымана паведамленне, што поўгадзіны назад з Комсамольска да месца пасадкі «Родины» вылецелі два самалёты. На адным з іх у палёт адправіўся лётчык Грамадзянскага паветранага флота тав. Сахараў, на другім — камдыў тав. Сарокін.

У 2 гадзіны 52 мінуты самалёты ўжо знаходзіліся над «Родиной». Яшчэ праз 35 мінут лётчык Сахараў паведаміў па радыё, што экіпажу «Родина» скінут на парашутах груз: прадукты, у тым ліку гарачае кофе ў тэрмасах, а таксама цёплая адзежа і карта з указаннем месцазнаходжання самалёта. Адначасова быў выкінут вымпел з умоўным кодам, карыстаючыся якім экіпаж «Родины» сігналізаваў, што ля самалёта знаходзяцца Грызадубава і Осіпенка.

Пры дапамозе гэтага-ж кода пілоты «Родины» паведамілі разведчыя самалёты, што штурман М. Раскова перад пасадкай самалёта спусцілася на парашуце. Яны таксама паказалі стрэлкай напрамак да яе мяркуемага месцазнаходжання.

Абследаваўшы раён у паказаным паўднёва-ўсходнім напрамку, лётчыкі, аднак, не знайшлі тав. Расковай.

У 4 гадзіны 06 мінут самалёты тт. Сахарава і Сарокіна вярнуліся ў Комсамольск. Адразу-ж пасля іх пасадкі тут пачалася падрыхтоўка групы самалётаў да росшукаў М. Расковай і высадкі паветранага дэсанта ў раёне месцазнаходжання «Родины».

У 8 гадзін 10 мінут шэсць самалётаў былі ўжо ў паветры. Гэтай групай машын камандаваў начальнік Далёка-Ўсходняга ўпраўлення Грамадзянскага паветранага флота тав. Пікаў. Самалётамі кіравалі пілоты Овечкін, Бурлакоў, Дзяркунскі, Раманаў, Сахараў. На адным з самалётаў знаходзіўся паветраны дэсант.

У 9 гадзін 05 мінут у Маскву было перадана, што ўсе самалёты падыходзяць да месца пасадкі «Родины». Неўзабаве машыны ўжо кружылі над серабрыстай птушкай, распасцёршай свае шырокія крыллі на вязкім балоце. Скінуўшы экіпажу «Родины» перапраўчныя сродкі, зброю, абмундзіраванне і прадукты, большая частка машын накіравалася на пошукі М. Расковай. Лётчыкі старанна абследвалі рэдкі балоцісты лес, які знаходзіцца ў паўднёва-заходнім напрамку ад самалёта.

Хутка ўрадавая камісія атрымала з Комсамольска радыёграму:

— У 9 гадзін 30 мінут трэці чалавек экіпажа «Родина» знойдзен у раёне сялення Дукі.

У гэты час над раёнам пасадкі самалёта «Родина» кружыў дэсантны самалёт. У 10 гадзін з яго былі скінуты два парашутысты — капітан Палежаеў і старшы лейтэнант Ерэмін. Парашутысты прызямліліся добра недалёка ад самалёта. Таварышы Грызадубава і Осіпенка радасна віталі парашутыстаў.

У 11 гадзін адбылася чарговая размова па прамому проваду з Комсамольскам-на-Амуры. З Комсамольска перадалі:

— Лётчыкі Грамадзянскага паветранага флота Дзяркунскі, Кірсанаў, бортрадыст Сіткоў і бортмеханік Федзін знайшлі ў рэдкім балоцістым лесе, прыкладна, за 20 кілометраў ад месцазнаходжання «Родины», трэцяга члена экіпажа «Родины» таварыша Раскову. Яна стаяла на паляне каля толькі-што разведзенага кастра і хусткай вітала лётчыкаў. З самалёта ёй скінулі прадукты, якія яна зараз-жа падабрала.

Урадавай камісіяй дадзена распараджэнне падрыхтаваць двух вопытных парашутыстаў і раніцою 5 кастрычніка скінуць іх з самалёта на дапамогу Расковай. Парашутысты снабжаюцца компасам, зброяй і неабходнымі прадуктамі харчу. Калі патрэбна будзе, ім будуць скінуты з самалёта гумавая лодка і лыжы.

Па плану тт. Грызадубава, Осіпенка і Раскова разам з парашутыстамі павінны выйсці да ракі Амгунь. Адсюль яны на гумавых лодках павінны даплыць да Ніжняй Каменкі, куды к гэтаму часу падыйдуць катеры, якія забяруць усю групу і даставяць у Кербі. З Кербі экіпаж «Родины» і парашутысты будуць перакінуты на самалётах спачатку ў Комсамольск, а потым у Хабараўск.

ЯК ІШЛІ ПОШУКІ САМАЛЁТА „РОДИНА“

Апошняя радыёграма з барта самалёта «Родина» была атрымана 22 верасня ў 6 гадзін 52 мінуты па маскоўскаму часу. Пасля гэтага радыёсувязь самалёта з зямлёй спынілася.

Па ўказанню ўрада былі прыняты экстраныя меры. Мясцовым арганізацыям Далёкага Ўсходу былі даны ўказанні аб арганізацыі нагляду за палётам самалёта і яго росшукаў усімі наяўнымі сродкамі.

Былі падставы лічыць, што адважны экіпаж «Родина», нават пасля спынення радыёсувязі з зямлёй, прадаўжаў палёт на ўсход. Гэта пацвярджалася весткамі, атрыманымі з розных пунктаў, ляжачых паблізу трасы пералёту. Асабліва многа паведамленняў было атрымана з раёна Кербі, размешчанага ў 130 кілометрах ад Комсамольска. У гэтым раёне пралёт самалёта наглядалі ў Дзям'янаўцы, Гуге, Гатцынцы, Каменцы, Дукі, у раёне возера Эверон і ракі Курмуш.

Такім чынам, урадавая камісія мела многія паведамленні аб пралёце самалёта ў напрамку да Комсамольска-на-Амуры.

Адразу-ж для росшукаў былі прыцягнуты 30 самалётаў. Апрача таго, былі арганізаваны буйныя пошукавыя партыі з мясцовых жыхароў, галоўным чынам, паляўнічых.

Да 30 верасня самалётамі, удзельнічаючымі ў пошуках «Родины», была абследвана велізарная тэрыторыя па абодва бакі чыгункі ад Чыты да Хабараўска. Апрача таго, шляхам прачосвання самалётамі мясцовасці, былі абследваны раёны па маршруту — Срэценск, Калакан, Тында, Рухлава і вялікая тэрыторыя па Магочы да ракі Олекмы.

1 і 2 кастрычніка самалётамі былі аблятаны новыя раёны.

Асаблівая ўвага была звернута на абследванне велізарнай тэрыторыі, размешчанай ад Комсамольска ў радыусе да 300 кілометраў.

Апошнія дні ў росшуках «Родины» прымала ўдзел звыш 50 самалётаў. Аднак да 3 кастрычніка пошукі не ўвянчаліся поспехам. Росшукам перашкаджалі неспрыяючыя метэаралагічныя ўмовы: нізкая воблачнасць, дажджы.

Адначасова з росшукамі прадаўжаўся няспынны нагляд за эфірам.

Для абследвання басейнаў рэк Амура і Амгуні і правядзення больш глыбокіх разведак была створана спецыяльная экспедыцыя. Яна складалася з двух цяжкіх гідрасамалётаў, маючых вялікі радыус дзеяння. Гэта экспедыцыя павінна была вылецець на Далёкі Ўсход раніцай 3 кастрычніка. Аднак гэтага не патрабавалася.

У 9 гадзін 52 мінуты раніцы 3 кастрычніка з Хабараўска па прамому проваду ўпаўнаважаны Наркамсувязі па ДВК тав. Псурцаў паведаміў народнаму камісару сувязі тав. Берману наступнае: «Сёння авіязвяно Грамадзянскага паветранага флота выявіла ў раёне Дукі (пункт на магістралі Комсамольск—Кербі) самалёт, па ўсёй магчымасці «Родина». Самалёт зрабіў пасадку ў балоцістай мясцовасці. Авіязвяно бачыла двух людзей, махаўшых лётчыкам палотнішчам. Зрабіць пасадку ў гэтым раёне нельга. Самалёт двухматорны, серабрыстай афарбоўкі. Па нагляданню лётчыкаў—гэта, безумоўна, самалёт «Родина».

Зараз камандаванне Ваенна-паветраных сіл і Грамадзянскага паветранага флота прымае меры да больш дакладнага высвятлення і арганізацыі дэсанта для выручкі экіпажа «Родина».

Урадавая камісія па атрыманні гэтых вестак дала распараджэнне мясцовым арганізацыям Комсамольска і Кербі неадкладна пачаць падрыхтоўку да аказання дапамогі экіпажу. К месцу знаходжання самалёта з Кербі ўжо вышаў маторны катэр, які дойдзе да згібу на захад ад стойбішча Верхне-Каменск, а вышэй пойдуць лодкі да 10 кілометраў. З Дукі накіроўваецца пошуковая партыя з рабочых і паляўнічых. Экіпажу самалёта «Родина» з малай вышыні будуць скінуты прадукты, медыкаменты, гумовыя боты, цёплае адзенне, гарачае кофе і какао ў тэрмасах. Абследваецца рака з мэтай высветліць магчымасць пасадкі на ёй гідрасамалёта або самалёта «У-2». Пры магчымасці будзе скінут парашутны дэсант, у тым ліку ўрач.

Урадавай камісіяй дано таксама ўказанне адправіць да месцазнаходжання экіпажа самалёта «Родина» пошукавыя партыі на аленях і конях для хутчэйшай дастаўкі экіпажа.

НА АБАРОНУ ДЭМАКРАТЫІ І МІРУ!

Да сумлення чалавецтва

Саюз чэхаславацкіх пісьменнікаў звярнуўся з наступнай адозваю:

«У грозную гадзіну, калі вырашаецца лёс свету, мы, што ніжэй падпісаліся, прадстаўнікі саюза чэхаславацкіх пісьменнікаў, звяртаемся да вас, носьбітаў сумлення чалавецтва, з наступнымі, глыбока прадуманымі словамі:

На працягу стагоддзяў мы жылі побач з нашымі суродзічамі, якія гавораць на нямецкай мове. Гэта быў час плённага сумеснага жыцця і спаборніцтва ў галіне культуры. Дабіўшыся зноў нацыянальнай незалежнасці, мы спадзяваліся, што наша зямля, наша агульная радзіма зробіцца ачагом новай Еўропы, лепшай і больш шчаслівай, і мы працавалі ў гэтым напрамку. У поўным усведамленні сваёй адказнасці перад гісторыяй звяртаемся з апошняга астраўка дэмакратыі, які застаўся ў Цэнтральнай Еўропе, з адозваю, у якой заяўляем, што наш народ не вінаваты і не будзе вінаваты ў пагражаючай свету катастрофе.

Мы імкнемся з усіх сіл абараняць мір, наш агульны мір. Але мы з усёй энергіяй будзем таксама змагацца за свабоду сваёй радзімы.

Мы звяртаемся да вас таму, што вы больш, чым хто-небудзь, заклікаваны абараняць тое, што да гэтага часу заўсёды з'яўлялася сумленнем Еўропы і ўсяго цывілізаванага свету: павага да ісціны, да свабоды і чыстага сумлення. Просім вас саміх вырашыць, на чыім баку сумленнае імкненне да міру і справядлівасці і на чыім захопніцкая прагнасць, якая карыстаецца ўсімі сродкамі гвалту і хлусні. Просім вас растлумачыць грамадскай думцы вашай краіны, што калі мы, невялікі народ, глыбока прасякнуты імкненнем да міру, будзем вымушаны прыняць самы люты бой у самым небяспечным месцы Еўропы, дык мы будзем весці нашу цяжкую барацьбу не толькі за сябе, але таксама і за вас, за маральныя і інтэлектуальныя каштоўнасці, агульныя ўсім свабодным і міралюбівым народам усяго свету. Няхай ніхто не робіць сабе ілюзій: пасля нас настане чарга іншых народаў, іншых краін.

Звяртаемся з просьбаю да ўсіх пісьменнікаў, усіх работнікаў разумовай працы, усіх, якія вераць у розум, усімі сродкамі, якія ёсць у іх, давесці гэты зварот да свядомасці ўсіх народаў свету.

Іозеф Чапек, Карэл Чапек, Я. Чарэк, Ян Чэп, Вацлаў Чэрні, Яраслаў Дурых, Гана Грэгарова, Францышэк Галас, А. Гофмейстар, Іозеф Гора, Ганус Елінек, Петр Ілемніцкі, Іозеф Копта, Іозеф Кнап, Яраслаў Квапіл, Францышэк Лангер, Эміль Лукач, Марыя Майерова, Б. Матэзіус, Рудольф Медэк, В. Незвал, Л. Новамескі, І. Ольбрахт, Фердынанд Перутка, М. Пуйманова, М. Рутэ, Яраслаў Зейферт, Анна Марыя Тыльшова, В. Ванчура.

ЗА МІР І СВАБОДУ

Паміж нашым лёсам — лёсам чэхаславацкіх пісьменнікаў і нямецкіх пісьменнікаў-эмігрантаў — вялікае падабенства; тыя-ж змрочныя сілы, якія прыгнятаюць наш народ, якія штурхнулі нас на шлях выгнання, пагражаюць цяпер вашаму народу, вашай свабодзе, вашай культуры.

Больш таго, нас даўно ўжо яднаюць аднолькавыя ідэалы, ідэалы свабоды, міру, дэмакратыі і гуманнасці. Цяпер гэта сувязь цясней, чым калі-б та ні было.

У цяжкую гадзіну выгнання мы даказалі сваю гатоўнасць бясстрашна і няўхільна, у самых цяжкіх умовах, змагацца за гэтыя непахісныя асновы жыцця, вартага чалавека, таму што жыццё пад уціскам хлусні і рабства для нас не мае цаны. Гэта дае нам права ўзняць цяпер свой голас і выказаць наша захапленне рашучасцю, дысцыплінаванасцю, любоўю да свабоды чэхаславацкага народа, аб'яднанага вялікім гуманістам Масарыкам, — наша захапленне і нашу ўдзячнасць. Неразрыўна наша духоўная і дзейсная сувязь з вамі, з усім чэхаславацкім народам, які стаіць пад пагрозай, і асабліва з тымі нямецкімі грамадзянамі Чэхаславацкай рэспублікі, якія знаходзяцца зараз у Судэтах, на фарпостах барацьбы за свабоду.

У гэтую гадзіну, так грозную небяспекай для вас, таксама як і для нас, для вашага народа і для нашага, для ўсіх народаў свету, мы запэўняем вас у нашай бязмежнай салідарнасці. Мы шлем вам прывітанне ў імя агульнасці нашага лёсу, які сёння яднае нас у агульным клопаце, а заўтра аб'яднае ў агульнай працы на карысць мірнага будучага нашых народаў.

ПРЭЗІДЫУМ САЮЗА АБАРОНЫ НЯМЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

Берт Брэхт, Эгон Эрвін Кіш, Ганс Сімсон, Роберт Брэйер, Альфрэд Кантаровіч, Анна Зегерс, Вольф Франк, Рудольф Леангард, Пауль Вестгейм, Бруно Фрэй, Ганс Марквіца.

Парыж.

САЛІДАРНАСЦЬ У БАРАЦЬБЕ

Мы, брытанскія пісьменнікі, што ніжэй падпісаліся, у імя праўды і свабоды заяўляем, што верым сваім прыяцелям у Чэхаславакіі і будзем іх падтрымліваць. Мы ведаем, што калі цяпер усяму свету пагражае вайна, дык у гэтым не вінаваты ні чэхаславацкі народ, ні яго ўрад.

Нас прыводзіць у жах кампанія фашысцкага насілля, якая разгарнулася ў Чэхаславакіі і за яе межамі. У прыватнасці, мы асуджаем злонамеранае і нават варварскае скажэнне праўды, пры дапамозе якога ўвесь час абманваюць нямецкі народ.

Небяспека пагражае не толькі Чэхаславакіі; пад пагрозай знаходзяцца таксама дэмакратыя, мір і цывілізацыя ўсяго свету, а толькі з іх вырастае сапраўдная культура. Таму мы, пісьменнікі, павінны стаць на абарону дэмакратыі, міру і цывілізацыі і на абарону іх прадстаўнікоў, над якімі навісла пагроза, г. зн. на абарону чэхаславацкага народа.

Філіс Бентлі, Джон Брофі, Рычард Чэрч, Луіс Голдзінг, Разамонда Леман, Генры В. Невінсон, Герман Ульд, В. С. Прытчэт, Эрнест Рэйтонд, Т. Стэрдж Мур, Эвелін Шарп, Олаф Стэльпдон, Філіп Оуэнс, Джыль Канстанцыя Фелен, Ірэн Рэтбон, Мэзі Шарман Т. Тампсон, Эдуард Сэквіль Уэст, «Сагітарыус», Стывен Спендэр, Элен Уодэл, Сільвія Тоунсенд Уорнер, Г. Дж. Уэлс, Э. Г. Юнг, Валентайн Оклэнд, Эрык Эмблер, Адрыян Брэнель, Віктар Коген, Маргарэт Гольдсміт, І. Б. О'Малей, Джофры Парсонс, Гаронві Рыс, Монтэгю Слейтэр, Джон Хэмдэн, Эдуард Хэттон, Кармель Хадэн-Гест, Хрыстына Гастынгс, Рычард Хол, Чарльз Кінг, Генрыета Леслі, Мартын Лес, Джэк Ліндсэй, Эдзіт Мэры Мур, Кетлін Нот, Барбара Нобл, Джым Фелэн, Э. Р. Пэншон, Марыс Рычардсон.

1908-ТРЫЦЦАЦІГОДДЗЕ РАБОТЫ В. І. ЛЕНІНА-1938

„МАТЭРЫЯЛІЗМ І ЭМПІРЫЯКРЫТЫЦЫЗМ“

МАГУТНАЯ СІЛА ПАРТЫІ

Вялікае значэнне кнігі Леніна «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм» было ў тым, што Ленін у перыяд сталыпінскай рэакцыі адстаяў супроць усіх і ўсякіх рэвізіяністаў і перараджэнцаў тэарэтычны фундамент комунізма, тэарэтычныя асновы марксісцкай партыі. Кніга з'явілася каштоўнейшым укладам у навуку і далейшым развіццём філасофіі марксізма, далейшым рухам наперад у навуковым пазнанні чалавецтва.

Гістарычны матэрыялізм ёсць паслядоўнае прымяненне да грамадскага жыцця, да гісторыі грамадства дыялектычнага матэрыялізма. Ён складае навукова-гістарычныя асновы марксізма. У сваёй кнізе Ленін аддае вялікую ўвагу абароне ад рэвізіі махістаў-эмпірыякрытыкаў матэрыялістычнага разумення гісторыі.

Рускія махісты — Багданаў, Юшкевіч, Базараў, Сувораў— апалчыліся супроць гістарычнага матэрыялізма Маркса. Яны сталі даказваць, што матэрыялістычнае разуменне гісторыі «ўстарэла». У процілегласць марксізму Багданаў стаў даказваць, што матэрыяльнае быццё грамадства і сазнанне—тоесны, што «сопыяльнае жыццё ва ўсіх сваіх праяўленнях ёсць свядома псіхічнае», што асновай жыцця грамадства з'яўляецца «вопыт», разумеючы пад вопытам псіхічныя перажыванні людзей. Здрада дыялектычнаму і гістарычнаму матэрыялізму прывяла Багданава да адмовы ад марксісцкага вучэння аб пролетарскай рэвалюцыі, аб дыктатуры пролетарыята, да прапаведзі буржуазна - меншавіцкай «тэорыі» роўнавагі. Аб класавай сутнасці гэтай тэорыі можна судзіць па таму, як закляты вораг ленінізма, вучань Багданава — Бухарын спрабаваў пры дапамозе гэтай тэорыі абгрунтаваць «ідэйкі» аб затуханні класавай барацьбы ў СССР і ўрастанні кулака ў сопыялізм.

Махісты - эмпірыякрытыкі даказвалі далей, што да законаў грамадства цалкам прымянімы законы біялогіі, законы энергетыкі. І ўся гэтая мерзасць падавалася пад выглядам «абароны» і «развіцця» марксізма.

Супроць усяго гэтага ідэалістычнага, рэакцыйнага хламу Ленін выступіў з сакрушальнай сілай. Ён даказаў што ўсе патугі эмпірыякрытыкаў ёсць ні што іншае, як падмена гістарычнага матэрыялізма ідэалістычным разуменнем гісторыі. Ленін піша ў «Матэрыялізме і эмпірыякрытыцызме», што «тэорыя тоеснасці грамадскага быцця і грамадскага сазнання ёсць **суцэльная бязглуздзіца**, ёсць **безумоўна рэакцыйная** тэорыя (Творы, т. XIII, стар. 265). «Матэрыялізм гістарычны прызнае грамадскае быццё незалежным ад грамадскага сазнання чалавецтва» (там-жа, стар. 266—267). «Грамадскае сазнанне **адлюстроўвае** грамадскае быццё — вось у чым заключаецца вучэнне Маркса» (там-жа, стар. 264).

На прыкладах з гісторыі Ленін абгрунтоўвае марксісцкі погляд на грамадства і яго законы, паказваючы, што толькі прымяненне да гісторыі дыялектычнага матэрыялізма Маркса дае сапраўды навуковую тэорыю развіцця грамадства. Філасофія марксізма ўяўляе адзіны і цэльны светапогляд, які не адступае ад сваіх прынцыпаў і не мірыцца ні з якімі палавінчатымі, напоўідэалістычнымі поглядамі.

Матэрыялістычнае разуменне гісторыі выходзіць з таго, што ў аснове ўсяго жыцця грамадства ляжыць «**спосаб здабывання сродкаў да жыцця,** неабходных для існавання людзей, **спосаб вытворчасці матэрыяльных здабыткаў**»... («Гісторыя ВКП(б)», раздзел IV). Развіццё прадукцыйных сіл грамадства, развіццё матэрыяльных умоў жыцця людзей з'яўляецца асноваю ўсяго гістарычнага развіцця. На гэтай аснове ўзвышаюцца ўсе грамадскія надбудовы: дзяржаўны лад, права, грамадскае сазнанне (навука, этыка, мастацтва і т. д.). У грамадскім матэрыяльным быцці трэба шукаць ключ да разумення законаў развіцця ўсяго жыцця грамадства, значыць, і яго духоўнага жыцця. «Якое быццё грамадства, якія ўмовы матэрыяльнага жыцця грамадства, — такія яго ідэі, тэорыі, палітычныя погляды, палітычныя ўстановы» («Гісторыя ВКП(б)», раздзел IV). Не сазнанне людзей вызначае іх быццё, а наадварот—іх грамадскае быццё вызначае іх сазнанне — вучыць марксізм. Марксізм - ленінізм, прызнаючы сазнанне вытворным ад матэрыяльных умоў жыцця грамадства, прызнаючы сазнанне залежным ад матэрыяльнага быцця і падпарадкаваным яму, разам з тым прызнае велізарнае значэнне грамадскага сазнання, велізарную сілу ўплыву надбудоў на ход грамадскага развіцця. Грамадскія надбудовы — ідэі, тэорыі, палітычныя погляды, палітычныя ўстановы, раз узнікнуўшы, аказваюць адваротнае ўздзеянне на эканамічны базіс.

Марксізм - ленінізм вучыць, што ёсць ідэі, тэорыі рэакцыйныя (напрыклад, фашысцкія), якія адстойваюць аджыўшы грамадскі лад, адстойваюць інтарэсы рэакцыйных сіл грамадства. І ёсць ідэі, тэорыі перадавыя, якія адстойваюць прагрэсіўныя сілы грамадства, што садзейнічаюць руху чалавецтва наперад. Асабліва вялікая арганізуючая, пераўтвараючая і мабілізуючая сіла перадавых ідэй, перадавых тэорый, калі перад грамадствам наспела задача гвалтоўнага адхілення старога, аджыўшага грамадскага ладу, рэакцыйных класаў, стаўшых тормазам у грамадскім развіцці.

Комуністычная партыя заўсёды апіралася на перадавыя ідэі, на перадавыя тэорыі. Стваральнікі і настаўнікі партыі—Ленін і Сталін заўсёды надавалі першаступеннае значэнне тэорыі і вучаць партыю ўменню спалучаць перадавую тэорыю з рэволюцыйнай практыкай.

Якая вялікая сіла перадавых ідэй, можна судзіць па таму, якое значэнне ў барацьбе за соцыялізм мела ідэйная барацьба партыі з яе ворагамі. Партыя выходзіла з таго, што для перамогі соцыялізма неабходна разбіць усе варожыя ленінізму тэорыі, у першую чаргу трацкісцкія «ідэйкі» аб немагчымасці перамогі соцыялізма ў адной краіне. Пры дапамозе гэтых буржуазных «тэорый» ворагі хацелі дэзарыентаваць наш народ. Перамога соцыялізма ў нашай краіне стала магчымай таму, што ленінская, сталінская тэорыя перамогі соцыялізма авалодала сазнаннем мільёнаў і ператварылася ў вялікую матэрыяльную сілу.

Настаўнікі комунізма, наша партыя заўсёды ахоўвалі чыстату сваёй тэорыі, не прынцыпова ацэ, вялі барацьбу супроць усякіх спроб скажэння і апашлення марксізма - ленінізма.

«Гісторыя ВКП(б)» працягвае вялікія традыцыі Маркса — Энгельса — Леніна. У гэтым творы тэарэтычныя асновы нашай партыі ўзбагачаны сусветна-гістарычным вопытам барацьбы рабочага класа ў эпоху імперыялістычных войн і пролетарскіх рэволюцый, вопытам барацьбы за перамогу комунізма ў СССР

(«ПРАВДА»). **П. ЮДЗІН.**

**

«Можа быць, найбольш яркім выражэннем таго высокага значэння, якое надаваў Ленін тэорыі, трэба было-б лічыць той факт, што ніхто іншы, як Ленін, узяўся за выкананне сур'ёзнейшай задачы абагульнення па матэрыялістычнай філасофіі найбольш важнага з таго, што дадзена навукай за перыяд ад Энгельса да Леніна, і ўсебаковай крытыкі антыматэрыялістычных плыняў сярод марксістаў. Энгельс гаварыў, што «матэрыялізму даводзіцца прымаць новы від з кожным новым вялікім адкрыццём». Вядома, што гэту задачу выканаў для свайго часу не хто іншы, як Ленін, у сваёй выдатнай кнізе «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм». Вядома, што Пляханаў, любіўшы забаўляцца над «бесклапотнасцю» Леніна наконт філасофіі, не рашыўся нават сур'ёзна прыступіць да выканання такой задачы».

(І. СТАЛІН, «Пытанні ленінізма». Выданне дзесятае, стар. 13—14).

**

«Большэвікі хацелі стварыць новую, **большэвіцкую** партыю, здольную быць узорам для ўсіх, хто хацеў мець сапраўдную рэволюцыйную марксісцкую партыю. Большэвікі рыхтавалі такую партыю ўжо з часоў старой «Искры». Яны рыхтавалі яе ўпарта, настойліва, не гледзячы ні на што. Асноўную і рашаючую ролю адыгралі ў гэтай падрыхтоўчай рабоце такія працы Леніна, як «Што рабіць?», «Дзве тактыкі» і т. д. Кніга Леніна «Што рабіць?» была **ідэалагічнай** падрыхтоўкай такой партыі. Кніга Леніна «Крок наперад, два крокі назад» была **арганізацыйнай** падрыхтоўкай такой партыі. Кніга Леніна «Дзве тактыкі соцыял-дэмакратыі ў дэмакратычнай рэволюцыі» была **палітычнай** падрыхтоўкай такой партыі. Нарэшце, кніга Леніна «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм» была **тэарэтычнай** падрыхтоўкай такой партыі».

«Гісторыя Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў)», раздзел IV.

ДА ЮБІЛЕЮ Т. Г. ШЭЎЧЭНКА

Ніжэй мы друкуем творы выдатнага ўкраінскага паэта-рэволюцыянера Тараса Грыгор'евіча Шэўчэнка, напісаныя ім у розныя перыяды жыцця. Пераклад на беларускую мову зрабіў паэт ПЯТРУСЬ БРОЎКА.

**

Як-бы вы знал, панічы,
Дзе людзі плачуць жывучы,
Дык вы-б элегій не стваралі,
Багоў дарма не выхвалялі,
На нашы слёзы плюючы.
За што, не знаю, называюць
Хаціну побліз гаю раем.
Я ў хаце мучыўся калісь,
У першы раз даўно цяклі
Мае там слёзы! Я не знаю,
Ці ёсць такое ў бога зло,
Што ў той хаціне не жыло?
А хату раем называюць!

Не называю не раем,
Хацінку тую побліз гаю
Над прудам у канцы сяла.
Мяне там маці спавіла,
І спавіваючы спявала,
Сваю нуду пераллівала
Сваёй дзяціне... У гаю
У той хаціне, у раю
Я бачыў пекла... Там няволя,
Работа цяжкая, ніколі
І памаліцца не даюць.
А маці добрую маю,
Там маладую, — у магілу
Нястача й праца палажыла.
Там бацька з дзеткамі сваймі
(рыдаў знядолены ад болю),
Не вытрымаў ліхое долі,
Памёр на паншчыне!.. А мы
Параззыпаліся між людзьмі,
Як мышаняты. Я да школы
Ваду прыносіць школярам,
Браты на паншчыну хадзілі,
Пакуль лабы ім пагалілі!
А сёстры, сёстры! Гора вам,
Мае галубкі маладыя!
Чаго на свеце жывеце?
Вы ў наймах выраслі чужыя,
У наймах косы пабялеюць,
У наймах, сёстры, й памраце!
Мне вельмі страшна, як згадаю
Хаціну тую, горкі час,
Такія справы, божа наш,
Мы творым, што завецца раем,
На праведнай тваёй зямлі!
У раю тым пекла развялі,
Другога у цябе чакаем,
З братамі ціха мы жывем,
Палі братамі мы арэм,
І іх слязамі паліваем.
А можа й гэта... не, не знаю,
А так здаецца... сам ты ёсць
(Бо без тваёй-жа божай волі
Не быў-бы з нас ніхто тут голы).
А можа ты і сам з нябёс
Смяешся, бацечка, над намі,
Ды можа раішся з панамі
Як правіць светам! Глянь-жа ты,
Вунь гай зялёны, вунь кусты,
А вунь з-за гаю выглядае
Прудок, няйначай палатно,
А вербы проста над прудом
Ціхусенька сабе купаюць
Свае галіны... Праўда, рай?
А падзівіся, ды спытай!
Як у раю такім жывецца!
Там кожны славіць і пяе
Табе адзінаму святому
За справы дзіўныя твае!
У тым і рэч! Хвалы нікому,
А кожны слёзы, кроў ліе. —
Хула ўсяму! Не, не! Нічога
Няма святога на зямлі...
А мне здаецца, што й самога
Цябе ўжо людзі праклялі!

Арэнбург, 1850.

—о—

Т. Г. ШЭЎЧЭНКА

—о—

МУЗА

А ты прачыстая, святая,
Сястра ты Феба маладая!
Мяне ты ў свой падол ўзяла
І ў поле, прэч, са мной пайшла,
І на магіле сярод поля,
Як тую волю на раздоллі
Туманам сівым спавіла.
І калыхала, і спявала,
Тварыла чары ты... і я...
О чараўнічанька мая!
Ты мне ўсюды пасабляла,
Мяне ты ўсюды даглядала.

У стэпу, бязлюдным стэпу,
Далёка ў няволі,
Ты сеяла, расцвітала,
Як кветачка ў полі!
Ды з казармы, той нячыстай
Чыстаю, святою
Пташачкаю вылецела,
І панада мною
Паімчала, заспявала
Ты, золатакрылай...
Жыватворчаю вадою
Сэрца акрапіла.

І я жыву, і нада мною
З сваею божаю красою
Гарыш ты зоранька мая.
Мая уцеха ты святая!
Мая ты доля маладая!
Не пакідай мяне. Уначы,

І ў дзень, і ўвечары, і рана
Лунай за мною і вучы.
Твой зрок я чысты успрымаю,
Век з праўдай быць. Дапамажы
Малітву мне чытаць да краю.
А як памру, мая святая!

Мая ты мама! Палажы
Свайго ты сына ў дамавіну,
І хоць адзіную слязіну
З воч неўміручых пакажы.

9 лютага 1858.
Ніжні Ноўгарад.

ДОЛЯ

Не хітравала ты са мною,
Ты другам, братам і сястрою
Была заўсёды. Ты ўзяла
Мяне маленькага за рукі,
І ў школу хлопца адвяла
Да п'янага дзяка ў навукі.

— Вучыся, сэрцайка, ты зноў,
З нас будуць людзі! — ты сказала.
А я й паслухаў, я чытаў,
І вывучыўся. А ты збрахала.

Што з нас за людзі? Ды дарма!
Не хітравалі мы з табою!
Мы проста йшлі: у нас няма
Няпраўды зерня за сабою.
Хадзем-жа, доленька мая!

Мой дружа бедны і ласкавы!
Хадзем-жа далей, далей слава.
А слава — запаведзь мая.

9 лютага 1858.
Ніжні Ноўгарад.

СЁСТРЫ

Праходзячы па бедных сёлах
Панаддняпроўскіх невясёлых,
Я думаў, — дзе спыніцца мне?
І дзе падзецца мне на свеце?
І потым бачу увасне:
Што дрэўцы ў садзе ў белым цвеце,
І на узгорачку стаіць,
Няйначай дзеўчына, хаціна.
Дняпро шырокі разгарнуўся!
Аж заяе бацька ды гарыць!
Гляджу: у цёмненькім садочку,
Пад вішняю у халадочку
Мая адзіная сястра!
Многапакутніца святая!
Нібы ў раю адпачывае,
Ды з-за шырокага Дняпра
Мяне гаротная чакае.
І ёй здаецца узнікае
З-за хвалі човен той, плыве...
І ў хвалі потым і знікае.
— Мой брацітка! Мая ты доля! —
І мы сустрэліся. А ты...
На паншчыне, а я ў няволі!..
Вось так нам давялося йсці
Яшчэ ад малку колкай нівай!
Сястра, маліся! будзем жывы,
Дык бог паможа перайсці.

20 ліпеня 1859.
Чэркасы.

**

І залатое, й дарагое
Зусім мне знайце, не шкада
Маёй-жа долі маладое.
А часам гострая нуда.
Душу агорне, аж заплачу.
Ды больш яшчэ, калі пабачу,
Як хлопчык у сяле адзін,
Бы адарваўся ад галін,
Пад плотам чахнучы ў лакуцы
Сядзіць у зрэб'і ў калючым.
І мне здаецца, гэта я,
Што маладосць сядзіць мая.
І мне здаецца, што ніколі
Не будзе хлопчык бачыць волі
Яе святой. Што між біды
Дарэмна, марна пралятуць
Яго найлепшыя гады,
Што ён не будзе знаць, дзе дзецца
На гэтым белым, вольным свеце,
І ў наймы доля павядзе,
А каб не плакаў у бядзе,
Каб толькі прытуліўся дзе,
Хтось у салдаты адвядзе...

1849.
Кос Арал.

**

Гатова! Парус мы напялі,
Пасунулі па сіняй хвалі
Між парасляў у Сыр-Дар'ю
Байдарку ці баркас ўмястоўны
Бывай, убогі Кос-Арале!
Нуду заклятую маю
Змог два гады ты разганяць.
І дзякую Ты-ж сам хвалі,
Што людзі тут цябе знайшлі
І зналі як прыстасаваць.
Бывай-жа, дружа! Ні хвальбы.
Ні ганьбы нават не сплятаю
Тваёй пустэльні; я не знаю
У другім краю мо' й нагадаю
Пра час даўнейшае журбы!

1849.
Кос-Арал.

ДА НОВАГА ТЭАТРАЛЬНАГА СЕЗОНА

ДРАМАТУРГ І ТЭАТР

Узбагачэнне рэпертуару тэатраў БССР у новым сезоне п'есамі аб нашай рэчаіснасці, сонечных днях нашай радзімы проста і непасрэдна залежыць ад таго, як будзе арганізавана творчае супрацоўніцтва тэатраў з драматургамі. І ў гэтым напрамку зараз патрэбны не агульныя заклікі і пажаданні, а сур'ёзная работа.

Мінулы тэатральны сезон узбагаціў наша мастацтва некалькімі арыгінальнымі п'есамі — творамі беларускіх драматургаў. Але гэтыя п'есы былі прысвечаны тэмам гістарычным, тэмам мінулага. Чаму атрымалася так, што за прайшоўшы год не паявілася ні адной п'есы беларускага аўтара аб сёнешніх днях, аб жыцці Совецкай Беларусі? У гэтым у значнай ступені вінаваты самі тэатры. Яны чакалі толькі што прынясе драматург. І калі драматург прыносіў свой твор, пачыналася так званая сумесная работа з аўтарам — перакройка ці дапрацоўка п'есы. Тэатры не бралі на сябе актыўнай функцыі — арыентаваць драматурга на патрэбную тэматыку, арганізаваць работу над найбольш актуальнымі, патрэбнымі гледачу тэмамі. Таму драматургі распрацоўвалі знаёмыя і прывычныя для іх тэмы. У выніку — давалі тэатрам п'есы, якія не адказвалі пярвейшаму патрабаванню гледача — паказаць у творах мастацтва нашу Чырвоную Армію, абаронную магутнасць краіны, квітненне нашай радзімы пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

Вельмі радуе тое, што ў новых рэпертуарных планах нашых тэатраў уключаны арыгінальныя п'есы на тэмы сучаснасці. Але большасць гэтых п'ес... не напісана. Поруч з імі ўключаны і п'есы драматургаў братніх рэспублік— п'есы, з якімі таксама тэатр яшчэ не знаёмы, арыентуючыся толькі на імя аўтара.

Патрэбна больш наважаць рэпертуарныя планы. Патрэбна зрабіць іх зусім рэальнымі, такімі, якія сапраўды могуць быць цалкам рэалізаваны перад гледачом. А гэта выклікае неабходнасць сталай работы з драматургамі, каб няспынна ўзбагачаць свой рэпертуар і мець рэальныя перспектывы на наступныя сезоны.

Тэатр павінен патрабаваць і ад драматурга большай адказнасці за сваю работу. Часам здаралася так, што аўтар прыносіў у тэатр толькі матэрыялы, накіды п'есы і лічыў на гэтым сваю асноўную ролю вычарпанай. Пачыналася спешная мантыроўка гэтых матэрыялаў, дапрацоўка іх.

Драматург павінен здаваць сваю п'есу тэатру толькі тады, калі ён як мастак адчувае, што гэта — поўнацэнны твор, варты быць паказаны на нашай сцэне. Але гэта зусім не адмаўляе неабходнасці сувязі драматурга з тэатрам ва ўсім перыядзе работы над п'есай. Наадварот, тэатр павінен клапатліва дапамагаць драматургу ва ўсім працэсе творчасці — ад абмеркавання тэмы да прыняцця канчатковай рэдакцыі.

Нашы тэатры маюць вопыт работы з беларускімі драматургамі. Як добры прыклад, варта адзначыць творчае супрацоўніцтва Дзяржаўнага Віцебскага тэатра з Я. Купалай, непарыўную творчую сувязь з Я. Коласам (у выніку—у рэпертуары тэатра дзве п'есы Якуба Коласа «Вайна» і «У пушчах Палесся»); Белдзярждрамтэатра з К. Чорным, К. Крапівой, З. Бядуляй. Гэтую сувязь тэатраў з драматургамі ў наступаючым сезоне трэба яшчэ больш умацаваць. Кожны тэатр павінен згрупаваць навакол сябе і замацаваць групу аўтараў, з якімі стала творча працаваць. Прыклады дружбы тэатраў з драматургамі—супрацоўніцтва А. Остроўскага з Малым акадэмічным тэатрам, А. Чэхава і М. Горкага з МХАТ'ам — паказваюць, як многа дае такая непарыўная сувязь і драматургу і тэатру.

У галіне драматургіі апрача памянёных вышэй аўтараў, працуюць тт. М. Клімковіч, І. Гурскі, П. Броўка, П. Глебка, І. Шапавалаў, Хв. Шынклер, М. Паслядовіч, Ю. Віцьбіч і інш. Драматургічныя кадры ёсць. Патрэбна толькі такая клапатлівая і сур'ёзная дапамога драматургам, у выніку якой у самы бліжэйшы час былі-б створаны новыя п'есы, адказваючыя патрабаванням нашай грамадскасці.

Нясмеласцю, баязню рызыкі тлумачыцца тое, што нашы тэатры не робяць ніякіх спроб выявіць новых драматургаў з асяроддзя маладых пісьменнікаў, таленавітай рабочай і калгаснай моладзі. Бытуе яшчэ старая традыцыя арыентавацца толькі на «імёны». З-за гэтага маладыя здольныя аўтары нават не спрабуюць штурмаваць глухую сцяну, якая адгароджвае іх ад тэатра. Час рашуча асудзіць такую практыку. Колькі ёсць прыкладаў таго, калі маладыя аўтары з дапамогай тэатраў стваралі выдатныя творы драматургіі. Да вырашэння гэтага пытання трэба падысці ў надыходзячым сезоне.

Якія практычныя мерапрыемствы могуць актывізаваць творчасць нашых драматургаў і выявіць маладыя сілы? Перш за ўсё — распрацоўка і шырокае абвяшчэнне грамадскасці перспектыўных тэматычных планаў на бліжэйшыя сезоны. Гэтыя планы будуць арыентаваць як сталых, так і маладых драматургаў на патрэбную тэатрам і нашаму гледачу тэматыку, прыцягваць да драматургічнай творчасці многіх пачынаючых аўтараў.

Не клапацілася аб творчай рабоце нашых драматургаў і выяўленні новых аўтараў і Упраўленне па справах мастацтваў. Упраўленне было звязана дагэтуль з драматургамі толькі праз сваю бухгалтэрыю. Пісьменнік прыходзіў ва Упраўленне пасля напісання п'есы для заключэння дагавору, а Упраўленне наогул не ішло да драматурга.

Трэба спадзявацца, што новае кіраўніцтва Упраўлення распачне сур'ёзную і вялікую работу па выяўленню і вырошчванню маладых драматургаў, па дапамозе творчай рабоце драматургаў БССР.

Асобна трэба спыніцца на пытанні рэпертуару калгасных тэатраў. Калгасныя тэатры, якія абслугоўваюць шырокія масы працоўных гарадоў і калгасаў БССР, амаль зусім не маюць у рэпертуары арыгінальных п'ес нашых драматургаў. Гэта недарэчная з'ява — вынік шкодніцкай дзейнасці былых «кіраўнікоў» Упраўлення па справах мастацтваў і недапушчальнай бесклапотнасці кіраўнікоў самых калгасных тэатраў. Між тым, калі сам калгасны тэатр клапоціцца пра ўзбагачэнне свайго рэпертуару арыгінальнымі п'есамі, ён дасягае значнага. Як добры прыклад, возьмем Барысаўскі калгасны тэатр. Гэты тэатр стала працуе з беларускімі драматургамі. У выніку ён першы паставіў вельмі цікавую арыгінальную п'есу К. Крапівы «Партызаны». Творчую сувязь з К. Крапівой тэатр замацаваў і ў наступаючым сезоне мяркуе паказаць свайму гледачу новую работу драматурга. Апрача гэтага, у рэпертуар тэатра ўключана яшчэ некалькі арыгінальных п'ес беларускіх аўтараў. Астатнія калгасныя тэатры не праяўляюць ніякай ініцыятывы па творчай сувязі з драматургамі БССР. І Упраўленне па справах мастацтваў чамусьці мірыцца з гэтым.

Тое, што ў мінулым сезоне на сцэне калгасных тэатраў з'явіўся рад убогіх па ідэйных і мастацкіх якасцях спектакляў, якія ніяк не маглі задаволіць гледача («Агні Маяка» і інш.) — суровы папераджальны ўрок. Упраўленне па справах мастацтваў і самі калгасныя тэатры павінны дабіцца таго, каб у наступаючым сезоне паказаць гледачу арыгінальныя творы на сучасную тэматыку. Магчымасці для гэтага ёсць. Драматургі БССР і маладыя аўтары, пры падтрыманні і дапамозе ім, могуць стварыць цікавыя п'есы для калгасных тэатраў.

У саюзе совецкіх пісьменнікаў БССР ёсць секцыя драматургаў. Якую-ж ролю адыграла яна ў справе стварэння рэпертуару? Амаль ніякай. Секцыя чамусьці ператварылася ў нейкі дапаможны орган рэперткома. Яна кантралюе (ды і то зрэдку) работу драматурга, калі п'еса яго прынята тэатрам, замест таго, каб дапамагчы яму ў працэсе творчасці. Не займалася секцыя і пытаннямі выяўлення, вырошчвання маладых аўтараў, павышэннем творчай кваліфікацыі драматургаў.

Зараз мірыцца з гэтым нельга.

Секцыя драматургаў і секцыя крытыкаў саюза совецкіх пісьменнікаў павінны ўважліва і прынцыпова разглядаць і крытыкаваць новыя драматургічныя творы, клапатліва дапамагаць творчасці драматургаў.

Драматургіі, як самастойнаму, вельмі складанаму і адказнаму жанру, дагэтуль не аддавалася патрэбнай увагі. Чамусьці лічылася зусім нармальным ствараць п'есу, не як самастойны твор, а выкройваць яе з напісаных раней у іншых жанрах твораў. У выніку — паяўленне п'ес невысокай драматургічнай якасці.

Секцыя драматургаў павінна ўдзяліць асноўную ўвагу пытанням развіцця драматургіі, як жанра, пытанням прафесіяналізацыі драматургаў.

Трэба спыніцца і на пытаннях пастаноўкі арыгінальных совецкіх п'ес. Часам было так. Драматург прыносіў тэатру п'есу, напісаную на хвалюючую тэму нашых дзён. Тэатр прыступаў да тэрміновай пастаноўкі яе, але не звяртаў увагі на галоўнае — на мастацкую вартасць спектакля, на ўдумлівую і арыгінальную рэжысёрскую і акторскую распрацоўку яго. Над пастаноўкамі класічных п'ес не шкадавалі сіл, сродкаў і часу. А над совецкімі актуальнымі п'есамі працавалі ў спешцы, неахайна. Такія выпадкі былі ў мінулым сезоне. Але гэта недапушчальна ганебная практыка не павінна паўтарацца зараз.

Пастаноўцы п'ес нашых драматургаў — хвалюючых п'ес на тэмы сучаснасці—павінна быць аддана ўся ўвага калектываў тэатраў, — цікавая рэжысёрская распрацоўка павінна быць спалучана з высокай культурай акторскага выканання, з яркім мастацкім афармленнем.

Усе гэтыя задачы не могуць быць з дастатковай паўнатой вырашаны без належнай дапамогі тэатрам з боку нашых партыйных і совецкіх органаў, усёй грамадскасці.

Шырокае абмеркаванне новых драматургічных твораў, няспынная ўвага грамадскасці да сцэнічнай распрацоўкі іх (прагляд і абмеркаванне рэпетыцый, макетаў афармлення і інш.) — вось аснова кантролю і дапамогі з боку грамадскасці, без чаго немагчыма вырашэнне адказных задач наступаючага сезона.

Беларуская драматургія ў гэтым сезоне павінна дасягнуць высокага ўзроўню ўсёй совецкай драматургіі — даць творы пра геніяў рэволюцыі, нашых настаўнікаў і правадыроў — Леніна і Сталіна, пра гераічныя справы вялікага совецкага народа.

Тэатральны сезон 1938—39 года павінен з'явіцца бліскучым перыядам паяўлення новых выдатных спектакляў аб нашай сёнешняй рэчаіснасці, сезонам вялікага творчага росквіту нашага тэатральнага мастацтва.

Да гэтага абавязвае набліжэнне выключна важнай падзеі ў жыцці нашага мастацтва — дэманстрацыя росквіту соцыялістычнага мастацтва Совецкай Беларусі на дэкадзе ў Маскве.

У гэтым артыкуле пастаўлены толькі некаторыя пытанні работы тэатраў з драматургамі. Лічачы іх надзвычай важнымі і актуальнымі, зараз, напярэдадні новага тэатральнага сезона, заклікаем драматургаў і работнікаў мастацтваў разгарнуць на старонках нашай газеты шырокае абмеркаванне творчых праблем развіцця нашай драматургіі.



Да пастаноўкі п'есы Н. Пагодзіна «Чалавек з ружжом» у Віцебскім дзяржаўным тэатры.
НА ЗДЫМКУ: злева направа: макет дома Сібірцава, Смольны і дарога на Пулкава. Мастак О. Марыкс. Фота Галышава і Каплінскага.



НА ЗДЫМКУ: комсамольцы-парты заны ў час грамадзянскай вайны.
Рэпрадукцыя Саюзфота.

ДА XXI ГАДАВІНЫ ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА І 20-гадовага ЮБІЛЕЮ ВЛКСМ

ДА УСІХ КІНОМЕХАНІКАЎ КІНОСЕТКІ БССР

Пісьмо кіномеханіка Чашніцкага раёна, Віцебскага абласнога кінотрэста, Бутэрава Івана Дзям'янавіча.

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ І СЯБРЫ ПА РАБОЦЕ!

Мы з вамі працуем у галіне самага важнага і самага масавага з мастацтваў — кіно. Наша комуністычная партыя, наш совецкі ўрад акружаюць совецкую кінематаграфію штодзённай увагаю і клопатамі. Гістарычнае рашэнне Соўнаркома Саюза ССР ад 23 сакавіка 1938 года дало большэвіцкую праграму дзеяння совецкай кінематаграфіі. Партыя, урад і асабіста наш вялікі, мудры таварыш Сталін не толькі паказваюць совецкай кінематаграфіі правільны шлях далейшага руху наперад, яны даюць нам усе неабходныя матэрыяльныя і тэхнічныя сродкі.

Таварышы! Па ўсёй вялікай совецкай краіне разгарнулася перадкастрычніцкае социялістычнае спаборніцтва ў гонар XXI гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі і 20-годдзя ленінска-сталінскага комсамола.

Уключаючыся ў перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва, я абавязваюся:

Даваць не менш 75 кіносеансаў у месяц па вёсцы. Пры кожным кіносеансе ў калгасе выпускаць светавыя газеты на матэрыялах жыцця калгасаў.

Арганізаваць і згуртаваць вакол сваёй кіноперасоўкі сталы актыў з асяроддзя настаўнікаў, аграномаў, урачоў, з дапамогай якіх праводзіць абмеркаванне лепшых кінокарцін у калгасах, соўгасах і МТС.

Беражліва адносіцца да ўсёй маёмасці кіноперасоўкі, у беззаганнай чыстаце трымаць кінопраекцыйную апаратуру і дабівацца максімальнай захаванасці тэхнічнай годнасці фільмаў.

Не дапускаць у рабоце ні адной аварыі.

Сістэматычна падымаць свой агульнаадукацыйны, палітычны і тэхнічны ўзровень.

К канцу 1938 года перадаць свой вопыт усім кіномеханікам раёнаў Віцебскага абласнога кінотрэста.

Таварышы! Я прыкладу ўсе свае намаганні да няўхільнага і дасканалага выканання пералічаных соцыялістычных самаабавязацельстваў. У соцыялістычным спаборніцтве на лепшае абслугоўванне выбараў у Вярхоўны Совет БССР, вясенна-пасеўнай кампаніі і ўборкі ўраджаю я заняў першае месца сярод кіномеханікаў Совецкай Беларусі, а ў жніўні даў 110 кіносеансаў, паставіўшы тым самым усесаюзны рэкорд. Да гэтага рэкорда я на працягу трох месяцаў даў 187 кіносеансаў, абслужыўшы 13.678 кінагледачоў, а за адзін жнівень мною было абслужана 10822 кінагледачы. Мая заработная плата за гэты месяц склала больш 1.200 рублёў.

Гэтых паказальнікаў я дасягнуў дзякуючы таму, што ўсю сваю работу вёў з дапамогаю мясцовага актыва. З дапамогаю гэтага актыва я распрацоўваю свой маршрут і дасканала выконваю яго. Абапіраючыся на актыў, я дабіваюся высокаякаснага абслугоўвання працоўных усяго раёна.

Нашу работу цэняць і паважаюць, калі мы толькі працуем добра. Мяне ўжо ў гэтым годзе Упраўленне кінофікацыі пры СНК БССР прэміравала два разы за высокія паказальнікі па кінаабслугоўванню мас. Беларускі рэспубліканскі камітэт кіно-фотаработнікаў за соцыялістычныя метады работы занёс мяне ў кнігу гонару і ўзняў хадайніцтва перад Цэнтральным камітэтам нашага саюза аб занясенні мяне ва Усесаюзную кнігу гонару.

Дарагія таварышы! Я аб гэтым кажу вам не з самахвальства, а толькі таму, што сумленная праца ў нашай роднай соцыялістычнай краіне — справа гонару, справа славы, справа доблесці і геройства.

Выклікаю вас, таварышы, на соцыялістычнае спаборніцтва і прашу вашы соцдагаворы накіроўваць у Беларускі рэспубліканскі камітэт саюза кінофотаработнікаў.

Арбітрам па выкананню соцыялістычных абавязацельстваў будуць: Упраўленне кінофікацыі пры СНК БССР і Беларускі рэспубліканскі камітэт саюза кіно-фотаработнікаў.

ІВАН ДЗЯМ'ЯНАВІЧ БУТЭРАЎ.

ПАСЛЯ СПРАВАЗДАЧНА-ПЕРАВЫБАРЧАГА СХОДА

Жорсткая крытыка дзейнасці камітэта арганізацыі ЛКСМБ Тэатра оперы і балета, якая разгарнулася на справаздачна - перавыбарчым сходзе, была зусім правільнай. Комсамольцы правільна ўказвалі на адрыў камітэта ад усёй арганізацыі і на развал комсамольскай гаспадаркі. У арганізацыі лічыліся людзі, якія па году не плацілі членскіх узносаў. Былы камітэт развaліў палітвучобу сярод комсамольцаў і зусім не цікавіўся творчай работай членаў арганізацыі і іх бытавымі ўмовамі.

Агульны сход арганізацыі, прызнаўшы работу камітэта нездавальняючай, выбраў у яго склад новых таварышоў, больш энергічных і працаздольных.

Пасля схода прайшло менш месяца. Але ўжо можна гаварыць аб некаторых зрухах у рабоце. Комсамольская арганізацыя, якая налічвае 30 членаў, разам з актывам несаюзнай моладзі, аб'яднана ў гуртні палітвучобы. Адзін гурток, у якім займаюцца па падручніку «Наша радзіма», займаўся ўжо два разы. Арганізован гурток і па вывучэнню Кароткага курса гісторыі ВКП(б). Узмацнілася абаронная работа. Працуюць гурткі ППХА, ГСА і варашылаўскіх стралкоў. Пачаўся прыём у комсамол новых таварышоў. На апошнім сходзе прыняты ў члены ЛКСМБ здольны саліст балета А. Петрашкевіч, які паказвае ўзоры творчай работы і ў прыватнасці з вялікім поспехам выконвае партыю ў балеце «Лебядзінае возера».

Найбольш моцнае комсамольскае ядро тэатра—чатырнаццаць асоб—знаходзяцца ў балеце. Сярод іх ёсць здольныя творчыя работнікі—салістка Даронiна, Саушкіна, Даронін, Карыфей, Залівака і інш. Значна горш з іншымі цэхамі. У цэху салістаў-спевакоў няма ніводнага члена ЛКСМБ. У хоры ўсяго пяць чалавек; у аркестры толькі два чалавекі. Крыху лепш у тэхнічных цэхах, дзе працуюць дзевяць комсамольцаў.

Новы склад камітэта прарабіў некаторую работу. Але гэта толькі першыя крокі. Камітэт ЛКСМБ і яго сакратар тав. Райнес не знайшлі яшчэ галоўнага звяна ў рабоце арганізацыі. Амаль нічога не робіцца ў галіне падрыхтоўкі да 20-годдзя ленінска-сталінскага комсамола. У камітэце ёсць меркаванні паставіць комсамольскую балетную сюіту, арганізаваць канцэрт, брыгады для выездаў у падшэфныя арганізацыі, але ніхто з членаў камітэта не мог сказаць, што робіцца для рэалізацыі гэтых меркаванняў.

У тэатры ёсць шырокая база для росту комсамола. Але камітэт яшчэ мала працуе ў гэтым кірунку. Тт. Драйчын, Новікава, Марыя Сцепанец, Якубаў і рад іншых таварышоў падрыхтаваны да ўступлення ў комсамол.

Дрэнна тое, што комсамольская арганізацыя Тэатра оперы і балета вельмі мала яшчэ цікавіцца бытам тэатральнай моладзі, хоць ёсць паасобныя сігналы пра небяспечныя з'явы ў гэтай галіне.

Першыя мерапрыемствы нававыбранага камітэта арганізацыі ЛКСМБ Тэатра оперы і балета сведчаць аб жаданні палепшыць работу ўсёй арганізацыі. Камітэту патрэбна больш рашуча і смела рэалізаваць вызначаныя ім добрыя планы.

Большэвіцкая падрыхтоўка да 20-годдзя ленінска-сталінскага комсамола, актыўны ўдзел у творчай рабоце тэатра да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве — важнейшыя бліжэйшыя задачы комсамольскай арганізацыі тэатра.

Ф. МІХАЙЛАЎ.

У дапамогу настаўніку

Творчасць Міхася Лынькова*)

* * *

А. МАСЛОЎСКІ

* * *

Лынькоў паслядоўна раскрывае карты ворага і апошнія сцэны аповесці «Апошні зверыядавец» у якіх раскрываецца сапраўдны твар паручыка Граеўскага, чытаюцца з захапленнем. Рысуючы вобраз Граеўскага-Гарашчэні, пісьменнік выхоўвае ў чытача пільнасць да ворага. І неабходна адзначыць, што гэту асноўную ідэю аўтар раскрывае пераканаўчымі мастацкімі сродкамі.

Вобраз Яшы ў аповесці «Апошні зверыядавец» выведзен як вобраз перадавога чалавека-комсамольца. Яша фізічна нязграбна губляецца перад маладой дзяўчынай Валяй, калі хоча з ёю аб'яснiцца, але ён знаходзіць у сабе досыць сілы, калі прад ім ва ўсёй шырыні ўстае задача барацьбы з ворагам.

Як тыповы вобраз комсамольца-перадавіка, у аповесці выведзен Сашка Кавадла — загадчык клуба. Яго комсамольскае чуццё дапамагае яму знайсці прычыны зла на заводзе, ён усе сродкі прыкладае да таго, каб разблытаць варожае павуціінне.

Цёплымі словамі апісвае Лынькоў вобраз маладой дзяўчыны Валі, дачкі рабочага Антона.

Заслугай Лынькова ў аповесці «Апошні зверыядавец» з'яўляецца тое, што аўтар праз паказ быту здолеў паказаць глыбокія палітычныя прычыны, якія гэты быт вызначылі. П'янства на заводзе, картачная ігра, антысемітызм — гэта не проста быт, у аснове гэтага ляжыць палітыка ворага. Выкрыванне гэтых бакоў старога быту і паказ праблем новага быту і росту новай соцыялістычнай маралі ляжыць у аснове ідэі аповесці. Гэтую асноўную ідэю аповесці пісьменнік рэалізуе на тэме — выкрыццё шкодніцтва ва ўмовах совецкай сапраўднасці. У гэтым і заключаецца асноўны станоўчы бок аповесці «Апошні зверыядавец».

Імкнучыся паказаць усе бакі жыцця і быту рабочых гуты, нарысаваўшы рад вобразаў і сітуацыі, аўтар у цэлым радзе месц сваёй аповесці не ўнікнуў і схематызма. Так, напрыклад, слаба ў аповесці паказана партыйная арганізацыя на заводзе і яе кіруючая роля. Многія бакі станоўчай работы комсамола апушчаны. Аўтар аддае перавагу абрысоўцы адмоўных бакоў жыцця моладзі; не бачым мы ў аповесці маладых дзяўчын. Не паказвае аўтар і таго, як старыя кадравыя рабочыя зжываюць сваю абмежаванасць — сваё ўяўленне аб моладзі, як не здольнай на актыўнае дзеянне. Усе гэтыя бакі ў некаторай меры зніжаюць мастацкую і соцыяльную поўнацэннасць аповесць «Апошні зверыядавец».

Драматычныя калізіі, уведзеныя аўтарам у аповесць, (напр., сцэна сустрэчы двух аднафамільцаў і інш.) падкрэсліваюць кампазіцыйную стройнасць аповесці. Але не заўсёды гэты прыём выкарыстоўваецца аўтарам к месцу, апраўдана: аўтар губляе пачуццё меры, ён не робіць шырокіх соцыяльных абагульненняў, не дае належных вывадаў, і часам лірычныя адступленні псуюць агульнае ўражанне, у іх мы бачым элементы штучнасці, залішняй сентыментальнасці і звышмернага псіхалагізавання. Гэта мы можам бачыць на аналізе апавяданняў «Гома» (1927 год), дзе праблема кахання зведзена пісьменнікам да бытавога выпадку, не атрымаўшы яскрава выражанага соцыяльнага гучання.

У перыяд разгорнутага соцыялістычнага будаўніцтва тэмай твораў Лынькова з'яўляецца паказ росту новых людзей, росту новай соцыялістычнай маралі і паказ таго, як ва ўмовах соцыялізма паступова ліквідуюцца перажыткі капіталізма ў свядомасці і эканоміцы людзей. Сама сутнасць гэтага перыяда, жывая і прывабная, вызначала і характар яго наступных твораў.

Надзвычайна цікавымі ў плане мастацкага росту творчасці Лынькова з'яўляюцца яго апавяданні «Баян» і «На вялікай хвалі». Створаныя на аснове канкрэтнага азнаямлення з будаўніцтвам Беламорканала, гэтыя апавяданні з'яўляюцца яскравай ілюстрацыяй палажэння марксізма аб тым што, перабудоўваючы прыроду, чалавек перабудоўвае сябе.

Ва ўмовах поўначы, на глебе, дзе ўпершыню ступала чалавечая нага, у невялікі тэрмін была створана велізарнейшая пабудова тэхнікі соцыялізма.

У апавяданні «Баян» (1923 г.) Лынькоў праз вобраз Андрэя Андрэевіча, былога злачынца — раскрывае перад чытачом паступовы цяжкі працэс перавыхавання людзей.

Педагагічна выхоўваючы кожнага ў паасобку, прыслухоўваючыся да інтарэсаў і нахілаў зняволеных, кіраўнікі будаўніцтва канала прыцягваюць у рады герояў працы сотні людзей, якія, кіруючыся часам анархічнымі павадзінамі, і на канале хочуць жыць сваім былым жыццём, нічога не робячы для агульнай карысці.

У вобразе Андрэя Андрэевіча пісьменнік выводзіць нам чалавека, жыццё якога кідала з месца на месца, які сваё сапраўднае прызванне атрымаў на канале.

Кіраўнік будаўніцтва канала улічвае глыбокую любоў Андрэя Андрэевіча да музыкі, і спецыяльна для яго купляецца ў горадзе каштоўны баян. Захоплены ігрой на ім, Андрэй Андрэевіч робіцца ўдарнікам, а потым і брыгадзірам ударнай брыгады.

Запамінаюцца тыя радкі, дзе Лынькоў апісвае, як Андрэй Андрэевіч іграе на старым гармоніку і як ён ідзе на склад зірнуць на новы гармонік. Працэс перараджэння чалавека адлюстраваны не як механічны, раптоўны, а як паступова, працяглы працэс унутранай перакоўкі чалавека.

Лынькову вельмі ўдалося перадаць адчуванне паўночнай прыроды. Паказ таго, як у гэты край балот і лясоў прыходзіць чалавек, авалодаўшы тэхнікай, з'яўляецца сюжэтным стрыжнем апавядання «Баян».

Гэтай-жа тэме перавыхавання людзей прысвечана і другое апавяданне Лынькова — «На вялікай хвалі».

Як і ў першым апавяданні, пісьменнік дае нам яскравы малюнак перакоўкі людзей на Беламорканале.

У цэнтры апавядання адзін вобраз— Сенька, у мінулым злодзей і бандыт, які зараз на канале атрымаў новую кваліфікацыю, паставіў сваё жыццё, як ён сам кажа, на «новую лоцыю, каб ішло яно правільна, без каменняў».

Вобразы гэтых двух апавяданняў Лынькова з'яўляюцца вельмі праўдзівымі — гэта па сутнасці асноўная асаблівасць стылю Лынькова, ён бачыць рэальных людзей, і ў сваіх апавяданнях апісвае іх лірычна-цёпла, з вялікай доляй пачуцця любві.

Побач з абрысоўкай станоўчых персанажаў, Лынькоў, як пісьменнік-педагог, выводзіць нам часта і адмоўныя вобразы нашай сапраўднасці.

Калі ў апавяданні «Кватэрмейстэр Бадай» (1932 г.) мы бачым скромнага простага чырвонаармейца ў абозе, гатуючага абед для чырвонаармейцаў і праяўляючага між тым у патрэбныя мінуты гераізм, то ў апавяданні «Сінія галіфэ» (1933 г.) Лынькоў паказвае нам дэзертыра Чырвонай Арміі—адшчапенца, прадаўшага агульныя інтарэсы і атрымаўшага адплату за свае ўчынкі.

У апавяданні «Сінія галіфэ» запамінаецца тая сцэна, калі Іван Гнёта быў злоўлен і прыведзен у полк. Ніхто не паглядзеў на гэтага адшчапенца, і калі яму вынеслі прысуд за дэзертырства — расстрэл, усе лічылі гэту меру пакарання вартаю.

Апавяданне «Сінія галіфэ» раскрывае перад чытачом адну з старонак жыцця і барацьбы Чырвонай Арміі, і ідэя гэтага апавядання — рост калектыўных пачуццяў і перамога іх над індывідуалістычнымі — праведзена Лыньковым па-мастацку і праўдзіва. Апавяданне мае вялікае выхаваўчае значэнне.

На прыкладзе чысткі партыі, на факце выкрыцця замаскаванага ворага пабудавана сюжэтная канва апавядання «Выпадак на чыстцы» (1933 г.).

Кампазіцыйна яно пабудавана так, што дзеянне ў ім нарастае з вялікай хуткасцю, і для таго, каб стварыць дынамічнае развіццё апавядання, аўтар уключае эпізод з мінулага жыцця старшыні камісіі Савасцеева і адсюль вядзецца ніць выкрыцця Грэбенчука.

Лынькоў умее адбіраць матэрыял для сваіх апавяданняў, з вялікай колькасці фактаў нашага жыцця ён выбірае тыя, якія з найбольшай сілай і паўнатой дазваляюць праявіцца асноўнай ідэі яго мастацкай творчасці — працэс фармавання новай соцыялістычнай індывідуальнасці, працэс росту новага чалавека.

Лынькоў майстар бытавога апавядання. У апавяданнях «У мястэчку», «Кларнет», «У вагоне», «Радо», «Манчжур» пісьменнік паказвае асобныя бакі жыцця людзей і працэс фармавання новага быту.

Людзі совецкай краіны, народжаныя соцыялістычнай рэволюцыяй, займаюць у творчасці Лынькова значнае месца. Тып новага чалавека, узрослага ва ўмовах соцыялізма, абрысован пісьменнікам у цікавым апавяданні «Талісман» (1932 год).

Перавага совецкіх людзей і перадавой тэхнікі — ляжыць у аснове ідэі гэтага апавядання.

У ім Лынькоў падымаецца да вялікага соцыяльнага абагульнення, ён паказвае, што іменна кіруе дзеяннямі лётчыка Джо (патрэба нажывы і славы), і што вызначае паводзіны совецкага лётчыка Сяргея (адданасць радзіме).

У цэнтры ўвагі апавяданняў Лынькова перыяда соцыялістычнага будаўніцтва стаіць чалавек — актыўны будаўнік соцыялізма, які загартоўваецца ў барацьбе з ворагамі народа.

Арганізацыя калгаса і разгарэўшаяся вакол гэтага класавая барацьба ў перыяд суцэльнай калектывізацыі, у перыяд ліквідацыі кулацтва — асноўная тэма апавяданняў Лынькова «Салавей-разбойнік» 1932 год) і «Саўка-ацігірнік» (1933 год).

Маляўніча апісвае Лынькоў, як масы сялянства вызваляюцца ад векавой улады зямлі і будуюць калектыўную гаспадарку. Неабходна адзначыць, што тэма калектывізацыі вёскі слаба акрэслена ў творчасці Лынькова ў гэты перыяд; аўтар у апавяданнях, прысвечаных тэме калектывізацыі, не стварыў соцыяльна абагуленыя тыпы, надзеленыя разам з тым канкрэтна індывідуальнымі рысамі.

Аналізуючы апавяданні Лынькова ранняга перыяда і перыяда соцыялістычнага будаўніцтва, трэба сказаць, што заслугай аўтара з'яўляецца тое, што ён адзін з першых у беларускай совецкай літаратуры распрацаваў і ма-мастацку адлюстраваў актуальныя праблемы нашай рэчаіснасці.

Вастрыня тэматыкі апавяданняў Лынькова, жыццёсцвярджаючы аптымізм яго творчасці, высокія мастацкія сродкі — ставяць Лынькова ў рад лепшых пісьменнікаў беларускай совецкай літаратуры.

У 1934 годзе Лынькоў стварае раман «На чырвоных лядах».

Для Лынькова-навеліста, пераважна, стварэнне такога вялікага твора з'явілася своеасаблівай творчай праверкай яго як пісьменніка.

Тэма рамана — паказ беларускага мястэчка перыяда імперыялістычнай вайны. Гэтую вельмі складаную задачу—паказ беларускай вёскі ў яе развіцці, паказ нарастання рэволюцыйнай барацьбы, рост нянавісці працоўных мас сялянства да кулакоў-эксплаататараў—пісьменнік імкнецца вырашыць у сваім рамане.

Людзі розных соцыяльных праслоек у іх узаемаадносінах — сяляне-беднякі, сераднякі, кулакі, папы, мястэчковая інтэлігенцыя, яўрэйская беднатавось што паказана ў гэтым рамане.

У цэлым радзе сцэн, эпізодаў Лынькоў рысуе суровую эксплаатацыю кулацтвам сялянства. З вялікай любоўю апісвае аўтар вобраз беднай жанчыны — салдаткі Настулі, муж якой быў забіты на вайне.

Вобраз Настулі — найбольш ўдалы вобраз у рамане «На чырвоных лядах». Сіла мастацкага ўспрымання гэтага вобраза заключаецца ў яго тыповасці.

Неймавернае гора пасцігае Настулю, калі яна атрымлівае пісьмо аб смерці на фронце свайго мужа — адзінага карміцельца сям'і. Гнеўным абвінавачаннем супроць імперыялістычнай вайны, яе зачыншчыкаў гучаць у рамане словы Настулі, звернутыя да сваіх дзяцей.

Словы Настулі пераклікаюцца з думкамі і пачуццямі салдат на фронце, у якіх спее рэволюцыйны пратэст супроць вайны, і гэты настрой добра перададзены аўтарам у іх лістах дамоў.

У рамане «На чырвоных лядах» Лынькоў паказаў прадстаўнікоў класа кулацтва, рабіўшых страшэнныя і агідныя справы.

Ідыятызм вясковага жыцця людзей, атручаных ядам уласнасці і суровага эгаізма, гранічна выразна вывеў Лынькоў у сцэне збівання Фёдара.

Абагуленым тыпам кулака — хітрага і наглага, з'яўляецца Іван Цыбал. Ён жорстка эксплаатуе сялян, забірае ў іх апошнюю маёмасць і ў яго асобе прыстаў, ураднікі і папы бачаць сваю апору на вёсцы.

Уся агіднасць гэтага чалавека раскрываецца Лыньковым у той сцэне, калі ў Настулі забіраюць апошнія пажыткі. Лынькоў паказвае вялікую нянавісць народа да кулака Цыбала.

Пісьменнік сатырычна востра высмейвае папоў, манахаў, усіх гэтых дармаедаў, якія прысмакталіся да цела працоўнага народа.

Неабходна адзначыць, што пры наяўнасці цэлага раду ўдалых і моцных месц у рамане, вобразных характарыстык, раман «На чырвоных лядах» не пазбаўлены сур'ёзных недахопаў.

Стаўшы на шлях добрасумленнага фатаграфавання жыцця мястэчка ў перыяд імперыялістычнай вайны, захапіўшыся насланнем бытавых эпізодаў, пісьменнік не зрабіў значных мастацкіх абагульненняў, не здолеў увасобіць гэтую эпоху ў суцэльныя збіральныя вобразы.

Цэнтральны персанаж, да якога-б сцягваліся ніці апавядання, у рамане адсутнічае. Партрэтныя характарыстыкі — самае слабое месца ў рамане. І гэта тлумачыцца тым, што аўтар увёў вялікую колькасць дзеючых асоб і не здолеў увасобіць іх у нешта мастацка цэлае.

У рамане «На чырвоных лядах» найбольш удаліся аўтару адмоўныя вобразы, але слаба абрысаваны станоўчыя вобразы — арганізатары рэволюцыйнай барацьбы ў вёсцы ў рамане паказаны бледна, і вобраз каваля Івана Іванавіча не ўключан у агульную канву рамана.

У першай кнізе рамана мы не бачым арганізуючай, авангарднай і кіруючай ролі пролетарыята ў рэволюцыйным руху на вёсцы.

Недахопам рамана «На чырвоных лядах» з'яўляецца яго кампазіцыйная рыхласць, якая выцякае з таго, што аўтар надзвычайна многа надае ўвагі нязначным дэталям, стварае багата ўводных персанажаў, — а ўсё гэта, разам узятае, не дапамагае раскрыццю тэмы рамана.

Пейзаж у рамане «На чырвоных лядах», як і ў папярэдніх яго творах, займае значнае месца. Ён арганічна ўваходзіць у апавяданне.

Лынькоў майстар-прыродаапісальнік. Асабліва добра паказан у рамане прыдняпроўскі пейзаж у ціхае надвор'е і той-жа пейзаж у непагоду.

Міхась Лынькоў добра ведае мову беларускай вёскі, умее перадаць спецыфічныя асаблівасці мовы розных соцыяльных груп людзей. Але між тым неабходна адзначыць, што аўтар, захапіўшыся этнаграфізмам, злоўжывае прывядзеннем вялікай колькасці правінцыялізмаў, дыялектызмаў і вульгарных парнаграфічных элементаў мовы, якія зніжаюць эстэтычнае ўспрыманне рамана.

Не гледзячы на тое, што пісьменнік прарабіў вялікую работу ў стварэнні вялікага палатна, раман «На чырвоных лядах» не з'яўляецца творчай удачай аўтара.

У 1935—1937 г. паяўляюцца аповесці Лынькова для дзяцей і аб дзецях — «Міколка-паравоз», «Янка-парашутыст», «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышоў».

Яшчэ ў ранніх сваіх творах Міхась Лынькоў абрысоўваў дзяцей (асабліва ў апавяданнях «У мястэчку», «Гой» і інш.), але ў гэтых творах ён спецыяльна бярэцца за дзіцячую тэматыку.

Пісаць для дзяцей — вельмі складаная і адказная задача. Зразумелай для дзяцей моваю апісвае Лынькоў падзеі, блізкія ўяўленню дзяцей.

Уладаючы вялікай колькасцю матэрыялу аб дзецях, пісьменнік імкнецца выхаваць у дзецях гераізм, смеласць і вынаходлівасць — гэта тэма аповесцей «Міколка-паравоз» і «Янка-парашутыст».

Прыгоды Янкі і Міколкі штурхаюць свядомасць нашай дзетвары да ўсведамлення канкрэтнай сапраўднасці, вучыць дзяцей разумець жыццё і прымаць актыўны ўдзел у ім.

Аповесці для дзяцей побач з ранейшымі творамі Лынькова маюць вялікае значэнне для творчага росту пісьменніка. Яны пашырылі кола назіранняў пісьменніка, узбагацілі яго мову і паказалі ўменне аўтара знаходзіць у нашай рэчаіснасці багацце тэматыкі.

Творчы шлях Міхася Лынькова — гэта шлях мастацкага асэнсоўвання нашай рэчаіснасці. Крок за крокам авалодваў Лынькоў мовай мастацтва, і актыўная творчая работа высунула яго ў рад лепшых пісьменнікаў Совецкай Беларусі.

Значэнне Лынькова, як пісьменніка, у беларускай совецкай літаратуры — вялікае. Пісьменнік у мастацкіх вобразах паказаў нараджэнне і рост новага чалавека ва ўмовах нашай соцыялістычнай рэчаіснасці. І ў гэтым заключаецца вялікая функцыянальная значымасць яго творчасці.

*) Працяг. Пачатак гл. у мінулым нумары.



На тактычных вучэннях Н-скай часці Кіеўскай ваеннай акругі.
НА ЗДЫМКУ: Танк на вучэннях.

(Саюзфота).



26 верасня ў Маскву вярнуўся з гастролей на Далёкім Усходзе Чырвонасцяжны ансамбль чырвонаармейскай песні і пляскі СССР пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР прафесара - ордэнаносца А. В. АЛЕКСАНДРАВА. На здымку група ўдзельніц Чырвонасцяжнага ансамбля. Злева направа: І-ы рад: З. Пашкова, М. Лаўрова, Г. Годава, 2-гі рад: Т. Ульянінская, А. Потапенка, Н. Светлова і З. Арсеньева; у цэнтры: злева направа: В. Александраў (сын прафесара А. В. Александрава), народны артыст СССР ордэнаносец І. М. Масквін, народны артыст СССР, прафесар-ордэнаносец А. В. Александраў, кампазітар Б. Александраў (сын прафесара А. В. Александрава) і жонка прафесара Александрава К. П. Александрава; Направа на здымку ордэнаносцы, І рад: Д. Барысаў, М. Разанаў, прафесар А. В. Александраў, камісар ансамбля Левантоўскі, Б. Вінаградаў, 2-гі рад: С. Новікаў, В. Максімаў, 3-юі рад: М. Палежаеў і І. Мар'ін на Яраслаўскім вакзале ў Маскве. (Дата здымка—верасень 1938 г.).

ТВАРЭЦ ПРОЛЕТАРСКАГА ГІМНА

8-га кастрычніка 1938 г. спаўняецца 90 год з дня нараджэння П'ера Дэгейтэра, творца музыкі «Інтэрнацыянала». Імя Дэгейтэра, рабочага-песняра, карыстаецца славай і павагай. Гэтая слава прышла да кампазітара толькі ў СССР.

10 год назад у Ліллі, горадзе, у якім упершыню прагучэў гімн пролетарыята «Інтэрнацыянал», быў урачыста адкрыты помнік стваральніку музыкі гімна. На помніку было імя кампазітара, але... не Дэгейтэра. Зусім староннї чалавек быў прызнаны аўтарам музыкі «Інтэрнацыянала».

Права на песню было аднята ў Дэгейтэра.

«Песня — гэта крылатая думка» сказаў Віктар Гюго. «Крылатую думку», няўгодную рэнегатам соцыялізма, узурпіравалі, перадалі менш небяспечным людзям, чым актыўны рэволюцыянер-змагар, арганізатар рабочых мас, пролетарый, кіраўнік харавых гурткоў, пясняр і кампазітар. Няпрызнаны, абняслаўлены гнюснай інтрыгай, аўтар «Інтэрнацыянала» быў выгнаны з роднага горада.

Бясконца доўга цягнуўся судовы працэс, пакуль аўтарскія правы Дэгейтэра не былі адноўлены.

Гісторыя стварэння гімна пролетарскай салідарнасці ўсялях замоўчваецца буржуазнымі гісторыкамі і музыкаведамі.

Наш народ любіць і цэніць песняроў народаў. Мы шануем Дэгейтэра за яго мэтаімкнёнасць і смеласць рэволюцыянера-кампазітара.

Час стварэння «Інтэрнацыянала» — перыяд, непасрэдна следуючы за крывавым разгромам Парыжскай Комуны.

Толькі пясняр-рэволюцыянер, які верыў у магутнасць пролетарыята, мог перакласці на музыку пераможныя строфы Эжэна Пацье—«салдата і паэта



ПЬЕР ДЭГЕЙТЭР.

Комуны» — рабочы па прафесії рэзчык па дрэву, майстар драўляных скульптур Пьер Дэгейтэр.

На рабочых святах ён распяваў і дырыжыраваў песні, якія сам складаў.

Член і кіраўнік левага крыла рабочага руху, энергічна змагаючыся супроць чыноўніцкага і рэнегацкага профсаюзнага кіраўніцтва, ён прысвячаў свае песні горасцям і надзеям пролетарыята.

Зараз «Інтэрнацыянал» — дзяржаўны гімн самага свабоднага і шчаслівага ў свеце народа — вялікага совецкага народа.

А. КАРПОВІЧ.

———○———

Брыгада Вялікага тэатра ў часцях БАВА

Брыгада артыстаў Дзяржаўнага акадэмічнага ордэна Леніна Вялікага тэатра Саюза ССР абслужыла рад часцей БАВА. У складзе брыгады: заслуж. арт. Пятрова, Ларыонаў, артысты Балрыдзе, Яхантаў, Селіванчў, Капусціна, Царман, Лазарэвіч.

Канцэрты артыстаў брыгады Вялікага тэатра ў чырвонаармейскіх часцях праходзілі з вялікім поспехам.

За 14-дзённае турнэ брыгада дала каля 20 канцэртаў.

В. М.

НА НАРАДЗЕ АКТЫВА МАСТАКОЎ

28 верасня ў Доме мастакоў адбылася нарада актыва саюза совецкіх мастакоў, прысвечаная абмеркаванню работы саюза і метадам яе перабудовы. У нарадзе прыняў удзел прадстаўнік Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР тав. Лебедзеў.

Выступіўшыя на нарадзе жывапісцы і скульптары тт. Грубэ, Бембель, Бразер, Гусеў, Станковіч, Кэрзін, Зайцаў, Дучыц — указалі на галоўныя недахопы работы саюза мастакоў і прапанавалі рад мер для іх ліквідацыі.

У рабоце саюза совецкіх мастакоў яшчэ моцна адчуваюцца вынікі шкодніцтва, якое праводзілася на працягу доўгага перыяда зараз выкрытымі ворагамі народа. Каб сарваць работу мастакоў, ворагі народа штучна стварылі цяжкую абстаноўку, сеялі склокі паміж мастакамі, накіроўвалі іх сілы і энергію на другарадныя ўчасткі, заахвочвалі заведамых халтуршчыкаў, ставячы іх у больш забяспечаныя матэрыяльныя ўмовы, чым сапраўдных майстроў, правальвалі палітычна-выхаваўчую работу, ігнаравалі мастацкае выхаванне, пазбаўлялі оргбюро саюза мастакоў самых неабходных сродкаў існавання і т. д.

Новае кіраўніцтва Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР дапамагае саюзу мастакоў ліквідаваць вынікі шкодніцтва, але дапамога гэта яшчэ недастаткова рашучая і актыўная.

У рабоце саюза мастакоў і на сёння ёсць яшчэ многа буйных недахопаў. Асноўны з іх—адсутнасць творчай абстаноўкі, якая спрыяла-б мастацкаму росту жывапісцаў і скульптараў, якая дапамагла-б мастакам ствараць высокаякасныя палотны, вартыя нашай эпохі. Крытыка і самакрытыка ў саюзе мастакоў вельмі слаба разгорнуты. Асабліва балюча некаторыя мастакі рэагуюць на крытыку іх работ, калі гэта крытыка ідзе ад сваіхжа таварышоў. На нарадзе чуваць былі галасы аб неабходнасці запрашэння некалькіх прафесіяналаў-крытыкаў з іншых цэнтраў і што толькі, маўляў, да такой крытыкі можна аднесціся яшчэ з адпаведнай увагаю. Такая ўстаноўка, зразумела, няправільная. Побач з дапамогаю прафесіянальных крытыкаў неабходна пастаянная дзелавая таварыская ўзаемадапамога. Толькі ў гэтым выпадку можа быць створана творчая абстаноўка.

Стварэнне творчай, таварыскай атмасферы цесна звязана з палітыка-выхаваўчай работай, якая на сёння ў саюзе мастакоў знаходзіцца ў поўным занядадзе. Сцвярджэнні некаторых мастакоў, што яны ў сябе дома «пачытваюць», а таму «не адстаюць ад жыцця» — не можа апраўдаць поўны развал палітыка-выхаваўчай работы ў саюзе мастакоў.

Зусім правільна мастакі адзначалі, што калі-б у Менску была карцінная галярэя, яна-б адыграла вялікую выхаваўчую ролю. Такое-ж выхаваўчае значэнне маюць выстаўкі-перасоўкі, персанальныя выстаўкі паасобных мастакоў, абмен мастацкімі выстаўкамі з братнімі рэспублікамі і т. д. Аднак, усе гэтыя дзейсныя формы мастацкага выхавання як саміх мастакоў, так і шырокіх мас працоўных — у нас не ўжываюцца. Між тым у нас ёсць шмат вельмі добрых мастацкіх твораў, якія гніюць і псуюцца ў сутарэннях розных музеяў і іншых устаноў.

Востра стаіць пытанне аб кадрах мастакоў. У БССР няма вышэйшай мастацкай школы. Віцебскі мастацкі тэхнікум у дрэнным стане. Большасць студый выяўленчага мастацтва працуе дрэнна.

Зразумела, у параўнанні з дакастрычніцкім перыядам, калі ў старой Беларусі налічваліся толькі тры мастакі-прафесіяналы, совецкія мастацкія арганізацыі маюць велізарныя дасягненні. Зараз у БССР налічваецца каля 80 мастакоў-прафесіяналаў, больш 200 мастакоў-самавучак, больш дзесятка студый выяўленчага мастацтва і т. д. Але гэтыя дасягненні былі-б значна большымі, калі-б арганізацыі і ўстановы, якія стаяць на чале мастацкага фронта, працавалі больш эфектыўна і энергічна ліквідавалі вынікі шкодніцтва.

Прапановы, высунутыя нарадай актыва мастакоў, паслужаць асновай для распрацоўкі раду мерапрыемстваў па аздараўленню работы саюза совецкіх мастакоў БССР.

П.

БЕЗАДКАЗНЫЯ АДНОСІНЫ ДА АДКАЗНАЙ СПРАВЫ

1 кастрычніка пад старшынствам намесніка старшыні Соўнаркома БССР тав. Захарава адбылося пасяджэнне Рэспубліканскай камісії па правядзенню трэцяй усебеларускай алімпіяды мастацкай самадзейнасці.

З інфармацый, зробленых прадстаўнікамі профсаюзаў швейнікаў, будаўнікоў, сувязі і загадчыка Гомельскім абласным Упраўленнем па справах мастацтваў, відаць, што падрыхтоўка да алімпіяды разгортваецца вельмі марудна. Ні адна профсаюзная арганізацыя не прадаставіла Рэспубліканскай камісії свайго плана падрыхтоўкі да алімпіяды. Больш таго, як высветлілася з паведамленняў прадстаўнікоў вышэйпаказаных трох профсаюзаў, такія планы нават не складзены. Многія цэнтральныя праўленні саюзаў не ведаюць, як рыхтуюцца да алімпіяды гурткі мастацкай самадзейнасці прадпрыемстваў і што яны рыхтуюць.

Так, напрыклад, работнік ЦП саюза сувязі тав. Харытановіч на пасяджэнні Рэспубліканскай камісії паказаў поўнае няведанне таго, што робіцца на перыферыі. Сярод падрыхтаваных да алімпіяды гурткоў мастацкай самадзейнасці, тав. Харытановіч назваў гомельскі, у той час, як, паводле заявы загадчыка Гомельскага абласнога ўпраўлення па справах мастацтваў тав. Каца, гэты гурток непадрыхтаваны і ў алімпіядзе не будзе ўдзельнічаць.

Ні адно прадпрыемства ў Гомелі не атрымала ўказанняў ад сваіх ЦП профсаюзаў аб удзеле ва ўсебеларускай алімпіядзе. Абласны аддзел народнай асветы ў Гомелі, які павінен падрыхтаваць да алімпіяды калгасныя гурткі мастацкай самадзейнасці, нічога не робіць у гэтым напрамку.

Такое-ж становішча ў Барысаве. Раённыя арганізацыі да алімпіяды не рыхтуюцца. Наогул, увага барысаўскіх арганізацый да мастацкай самадзейнасці за апошні час значна аслабла. Таму на некаторых прадпрыемствах гурткі распаліся. Мастацкая самадзейнасць заменена амаль выключна кіносеансамі і танцулькамі (клубы шклозавода, чыгуначнікаў). Гурткі клуба імя Горкага (фабрыка імя Кірава), як правіла, працуюць са старым рэпертуарам.

Дрэнна рыхтуюцца да алімпіяды дамы соцыялістычнай культуры. Да першага кастрычніка Наркомасветы не даў ніякіх указанняў сваім раённым і абласным аддзелам народнай асветы аб падрыхтоўцы да алімпіяды. Слабы ўдзел прымаюць райкомы комсамола, радыёкамітэт. Не ўключыўся ў падрыхтоўку да алімпіяд рэспубліканскі, абласны і раённы друк.

Рэспубліканскай камісії давялося канстатаваць адставанне па ўсіх лініях падрыхтоўкі да алімпіяды. Наркомасветы, профсаюзам, радыёкамітэту, друку дан рад указанняў аб узмацненні падрыхтоўкі да раённых, абласных і рэспубліканскай алімпіяд мастацкай самадзейнасці.

**

Згодна рашэння рэспубліканскай камісії па правядзенню трэцяй усебеларускай алімпіяды мастацкай самадзейнасці, Дом народнай творчасці павінен быў накіраваць у дапамогу раёнам і абласцям пяць брыгад у складзе пяцідзесяці высокакваліфікаваных актораў, музыкантаў, танцораў, спевакоў і інш. Не гледзячы на тое, што раённыя алімпіяды павінны былі пачацца першага кастрычніка, брыгады да гэтага часу ў дапамогу раёнам не пасланы.

Кіраўнікі тэатраў, якія павінны вылучыць брыгады для дапамогі гурткам, вельмі неахвотна адпускаюць сваіх работнікаў, або адпускаюць слабейшых. Некаторыя-ж работнікі мастацтва адмаўляюцца ехаць зараз у раёны. Напрыклад, паасобныя акторы Яўрэйскага тэатра, вылучаныя для паездкі ў раёны, прыводзяць дзесяткі прычын, якія нібы перашкаджаюць ім ехаць. А Упраўленне па справах мастацтваў ліберальна адносіцца да такіх заяў і, такім чынам, выезд брыгад затрымліваецца.

**

Наркомасветы БССР разаслаў 3 кастрычніка тэлеграмы 26 раённым і абласным аддзелам народнай асветы з прапановай неадкладна ўключыцца ў падрыхтоўку алімпіяд.

В. Д.

Ю. ДВОРКІНА

ДЗІДРО, ЯК МАСТАК

(ДА 225-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ)

5 кастрычніка 1713 года нарадзіўся славуты асветнік, лепшы прадстаўнік французскіх матэрыялістаў, бліскучы змагар супроць феадальнага ладу і яго ідэалогіі Дэні Дзідро.

У сярэдзіне XVIII ст. у Францыі пачынаецца магутная ідэалагічная плынь, вядомая пад назваю асветы. Ад імя трэцяга саслоўя лепшыя людзі яе выступалі з бліскучай, глыбокай крытыкай феадалізма, царквы, духавенства, дваранства, патрабуючы месца ў жыцці для свайго саслоўя. Асветнікі гаварылі ад імя дэмакратыі супроць дваранства, ад імя навукі супроць забабонаў і фанатызма, падрыхтоўвалі ў розумах людзей ідэі Французскай рэволюцыі. Энгельс гаворыць аб асветніках: «Вялікія людзі, прасвятліўшыя французскія галовы для набліжаўшайся рэволюцыі, самі былі крайнімі рэволюцыянерамі»[1]).

Сярод бліскучай плеяды асветнікаў (Вольтэр, Гольбах, Гельвецый, Д'Аламбер і інш.) асабліва вылучаецца сваёй прынцыповасцю, бясстрашнасцю, бліскучым палемічным і мастацкім талентам Дэні Дзідро. Сам выхадзец з народа, сын дробнага скуранога прадпрыемцы, Дзідро ўжо да 40 год, дзякуючы сваім філасофскім творам, становіцца ідэйным правадыром французскіх матэрыялістаў. Атэіст і дэмакрат, Дзідро нярэдка праследваўся ўладамі, не раз адбываў турэмнае зняволенне, але бясстрашна прадоўжваў сваю вялікую справу.

У 1750 г. пасля выхаду з Венсонскай турмы, дзе ён быў зняволены за сваё «Пісьмо пра сляпых», ён задумаў выданне «Энцыклапедыі», як сродка прапаганды новага буржуазнага светапогляду і барацьбы з феадальнай ідэалогіяй. У «Энцыклапедыі» прынялі ўдзел Гольбах, Вольтэр, Русо, Д'Аламбер і рад іншых выдатных асветнікаў. У 1751 г. ужо вышаў яе першы том. У артыкулах «Энцыклапедыі» асветнікі імкнуліся па-новаму перарасэнсаваць свет, перацаніць усе ранейшыя каштоўнасці, распрацаваць асновы буржуазнага светапогляду, бічаваць фанатызм і тыранію. Аднак рэпрэсіі, якія пасыпаліся на іх, адштурхнулі многіх з іх ад удзелу ў гэтай рабоце (напрыклад Вольтэра). Дзідро не здаўся і з нечуванымі цяжкасцямі, змагаючыся і перамагаючы іх, не гледзячы на пагрозы інквізіцыі і турэмныя зняволенні, у 1772 г. ён скончыў сваё любімае дзецішча — Энцыклапедыю.

Дзідро адзіўляў універсалізмам сваіх ведаў. У многіх галінах навукі (тэатр, тэхніка, літаратура, эстэтыка, філасофія) ён зрабіў каштоўныя ўклады сваімі працамі.

Эстэтычныя погляды Дзідро пададзены ў радзе яго твораў, як напрыклад у артыкуле Энцыклапедыі «Аб цудоўным», у работах «Гутаркі аб «Пабочным сыне»[2]) «Аб драматычнай паэзіі», «Парадокс аб актору», «Нясцромны скарб» і інш.

Цэнтральным пытаннем эстэтыкі Дзідро з'яўляецца барацьба за рэалізм, за вывучэнне жыцця і ўзнаўленне жыццёвай праўды. Правільна разумеючы сутнасць рэалізма, Дзідро настойліва перасцерагае мастака ад рабскага капіравання жыцця. Ен заклікае да абагульнення жыццёвых з'яў, да падачы істотных бакоў рэчаіснасці.

Як прадстаўнік маладога, узыходзячага класа, змагаючагася за свае правы, Дзідро бачыў у мастацтве магутную ідэалагічную зброю, патрабаваў ад яго ваяўнічасці, ідэйнай насычанасці.

Асаблівую ўвагу аддаваў Дзідро тэатру, як віду мастацтва, найбольш даступнаму шырокім народным масам. Тэатр, як сродак выхавання чалавека, асветы і навучання яго, у часы Дзідро не задавальняў гэтым патрабаванням. Дзідро абвяшчае паход супроць класіцызма, крытыкуе трагедыі Карнеля, Расіна за іх ненатуральнасць, надуманасць, халульнасць. Дзідро пратэстуе супроць таго, што ў іх трагедыях дзеючыя асобы ўсе або каралі, або героі, або прыдворныя. Змагаючыся за буржуазнае мастацтва, Дзідро высунуў новы жанр сямейна-бытавой драмы. Ён выступае за рэформу сюжэта, патрабуючы, каб сюжэты браліся з рэальнага, штодзеннага жыцця трэцяга саслоўя; ён заяўляе, што іменна сярэдні чалавек, прадстаўнік трэцяга саслоўя, павінен заняць тое месца ў драмах, якое да гэтага часу адводзілася толькі каралям і героям.

Сам Дзідро таксама напісаў некалькі сямейна-бытавых драм, як напрыклад «Пабочны сын», «Бацька сямейства», «Добры ён ці кепскі», дзе ажыццявіў свае эстэтычныя прынцыпы.

Асабліва выдатна раскрываецца мастацкі талент Дзідро як пісьменніка ў яго рэалістычных аповесцях «Манахіня» (1760 г.), «Пляменнік Рамо» (1762 г.), «Жак-фаталіст і яго пан» (1773 г.). Аповесць «Манахіня», напісаная ў форме пісьмаў адной дзяўчыны Сюзанны Сімонен, супроць сваёй волі заключанай у манастыр, з'яўляецца страшэннай аповесцю аб жахах манастырскага жыцця, страсным пратэстам супроць скажэння натуральных імкненняў чалавека. Яна носіць ярка выражаны антыцаркоўны і антыклерыкальны характар.

Дзідро заяўляе, што ўсе рэлігійныя законы праціўны чалавечай прыродзе, яны скажаюць натуральныя яго імкненні. У імя свабоды чалавечай асобы ад путаў сярэдневякоўя Дзідро патрабуе знішчэння ўсякіх рэлігійных устаноў.

15 красавіка 1869 г. Маркс пісаў Энгельсу: «Сёння я выпадкова знайшоў у сябе дома два экземпляры «Пляменніка Рамо». Шлю табе адзін з іх. Гэты неперайма льны твор даставіць табе яшчэ раз магчымасць адчуць асалоду ад яго». Энгельс называе твор «Пляменнік Рамо» высокім узорам дыялектыкі.

Сапраўды Дзідро змог у бліскучай дыялагічнай форме, у гутарцы паміж сабою і пляменнікам Рамо, сарваць маскі з сучаснага яму не толькі дваранскага, але і вярхушкі буржуазнага грамадства, выкрыць яго разбэшчанасць, сапсаванасць, прадажнасць.

Рамо — пляменнік славутага музыканта Рамо. Яго вуснамі раскрывае Дзідро соцыяльныя супярэчнасці сваёй эпохі.

Сам пляменнік Рамо — бліскуча паказаны вобраз падхаліма, зводніка, які жыве падачкамі багацеяў, разыгрывае перад імі штукара. Гэта — чалавек без усякіх маральных прынцыпаў, без усякіх разуменняў аб абавязках, маралі, гонары і т. д. Ен расцэньвае ўсё толькі з пункту погляду выгады. Рамо — амаральны, эгаістычны. Але іменна ў прамовах Рамо раскрываецца бязлітасная праўда аб тым свеце, дзе побач існуюць багацце і беднасць, дзе людзі імкнуцца трапіць у багачы якім-бы то ні было шляхам. Рамо — таленавіты музыкант, але адной музыкай у гэтым свеце не пражывеш. Ні старому, дваранскаму свету, ні буржуазным выскачкам не патрэбны таленты. Геніяльныя людзі паміраюць з голаду, а шчасліва жывуць зводнікі, штукары, падхалімы, блюдалізы. Само грамадства зрабіла Рамо такім. І бязлітасная праўда гучыць у вуснах Рамо, калі на папрок Дзідро аб амаральнасці злалзейства ён адказвае: «О! Я краў без усякіх згрызот. Есць прыказка: злодзей у злодзея крадзе — чорт пацяшаецца. Бацькі маіх вучняў не ведалі куды дзяваць грошы, набытыя цёмнымі справамі: гэта былі прыдворныя адкупшчыкі, буйныя камерсанты, банкіры, дзялкі; я дапамагаў ім вяртаць назад нарабаванае».

Такім чынам, Дзідро ужо бачыць шляхі набыцця багацця, крытыкуючы вярхушку буржуазіі, ён гаворыць ад імя народных мас.

У Рамо няма і не можа быць ніякіх прынцыпаў, бо ён пераймае ва ўсім ад сваіх знатных і багатых апякунаў. Яго ідэал — гэта ідэал вышэйшых класаў, яго мараль толькі паўтарае іх мараль. А яна кажа так: «Зарубіце сабе на насу—няхай жыве філасофія, няхай жыве мудрасць Саламона: піць добрыя віны, аб'ядацца ўдалікатненымі блюдамі, блытацца з прыгожанькімі жанчынамі і спаць на пуховых пасцелях! За выключэннем гэтага, усё іншае—мітусня мітусняў!» Гэта — тыповая філасофія разбэшчаных класаў, бясконца далёкіх ад жыцця народа, якія гоняцца толькі за асалодамі. Рамо правільна адказвае на пытанне Дзідро аб тым, ці адмаўляе ён бацькаўшчыну. Рамо гаворыць: «Мітусня мітусняў! Няма больш бацькаўшчыны: ад аднаго полюса да другога я ні бачу нікога, апрача тыранаў і рабоў». Ва ўсіх пытаннях грамадскага жыцця, напрыклад, у пытаннях шлюба, выхавання дзяцей, у адносінах да геніяльных людзей і т. д.—усюды Рамо прымяняе адну толькі мерку — выгаднасць. Але не ён віною гэтаму, ён такі, якім яго зрабілі сапсаваныя вярхі. Але па ім можна меркаваць аб норавах вышэйшага грамадства. Рамо адрозніваецца ад іх толькі тым, што без усякага цэню ліцамер'я і ханжаства, з шчырасцю, якая даходзіць да цынізма агаляе ўсе прыкрыя бакі гэтага сапсаванага грамадства. Такім чынам, Дзідро ўказаў на супярэчнасці ў толькі яшчэ складваючымся буржуазным ладзе.

Вобраз «Пляменніка Рамо» — вобраз прыніжанасці і разбэшчанасці, прагнасці і падхаліміства, галечы і растаптанай чалавечай годнасці — з'яўляецца грозным прыгаворам вышэйшым класам. Бліскучае раскрыццё супярэчнасці развіцця буржуазнага грамадства зрабіла гэты твор «высокім узорам дыялектыкі». (Энгельс).

Далейшым паглыбленнем рэалізма Дзідро, у разуменні і паказе праўды жыцця, з'яўляецца яго вялікая філасофская аповесць «Жак-фаталіст і яго пан». Кампазіцыйна гэта аповесць уяўляе сабою рад асобных навел у стылі рамана Стэрна «Трыстрам Шэндзі». Аснова сюжэтнай лініі аповесці — расказ слугі Жака гаспадару аб сваім першым каханні. Але Жаку не ўдаецца доўга расказваць сваёй гісторыі. Расказ яго ўвесь час перапыняецца рознымі сустрэчамі, уводнымі навеламі, аўтарскімі адступленнямі, размовамі Жака і яго гаспадара і т. д.

Па сутнасці, іменна гэтыя ўводныя навелы і ствараюць рэалістычную карціну нораваў XVIII стагоддзя. У іх перад чытачамі праходзяць людзі розных саслоўяў і прафесій ва ўсёй сваёй разнастайнасці. Сяляне і арыстакраты, купцы і авантурысты, шынкары і слугі, манахі і прастытуткі — прадстаўляюць сабою стракатую, рэалістычную галерэю тыпаў. У аповесці вылучаюцца два асноўныя прынцыпы падбору навел. Першы з іх — філасофскі — звязан з вобразам слугі Жака, які з'яўляецца філосафам. Жак — фаталіст, г. зн., правільней, ён — чалавек, які лічыць, што ў свеце ўсё дэтэрмініравана. Воля чалавека несвабодна, жыццё чалавека вызначаецца грамадскімі ўмовамі. Рад навел, глыбока рэалістычных, праўдзівых, тыповымі вобразамі ілюструе як гэта становішча Жака, так і яго сцверджанне аб тым, што жыццё складанае і нельга выносіць сваіх меркаванняў без глыбокага вывучэння яго. Адна з навел гэтай часткі, навела аб помсце маркізы дэ-ла-Помрэ, выклікала захапленне Гётэ. Разуменне Жака дэтэрмініраванасці чалавечага лёсу — рэволюцыйнае. Рад умоў вызначаюць лёс чалавека, дык для палепшання чалавечага жыцця іх трэба змяніць. Гэта думка раскрываецца ў алегарычнай навеле аб замку.

Другі-ж прынцып падбору навелы — гэта сатырычна-рэалістычны паказ жыцця XVIII стагоддзя ў стыле Бакачыо ці Раблэ. Зноў праходзяць тут перад чытачом здзіўляюча пластычныя вобразы — персанажы XVIII стагоддзя. Тут вясковы поп, захоплены раўнівым мужам на месцы злачынства, святоша-манах Жан, які выдае замуж дзяўчат, што хутка раджаюць дзяцей на яго падобных, авантурыст-дваранін дэ-Сент-Уан, разбэшчаны, але хітры настаяцель манастыра, спрытна абыйшоўшы сваіх ворагаў і т. д.

Жыццерадаснасць гэтых навел, рэалізм мастацкіх вобразаў, абарона натуральных пачуццяў чалавека — усё гэта звязвае аповесць «Жак-фаталіст» з творамі гуманістаў эпохі Адраджэння.

Але Дзідро глыбей ускрывае жыццё, чым яны. Ен агаляе супярэчнасці рэчаіснасці, звяртае ўвагу чытача на складанасць жыцця і складанасць чалавечых учынкаў. Адзін і той-жа чалавек у залежнасці ад умоў можа рабіць добрыя і дрэнныя ўчынкі, ён падбірае такія з'явы, якія, будучы глыбока тыповымі і праўдзівымі, малююць жыццё у яго супярэчлівасці.

Малюючы ўзаемаадносіны Жака і яго пана, Дзідро прадоўжвае маючуюся ў літаратуры лінію паказу разумных, спрытных слуг, якія стаяць вышэй, чым іх гаспадары. Як слугі, людзі ніжэйшага саслоўя, яны падпарадкаваны сваім панам, але ўжо пачынаючы адчуваць сваю перавагу, заяўляюць аб сваіх правах. Дзідро ўскрывае палітычную сутнасць спрэчак Жака і яго пана, ён абагульняе вобраз Жака, гаворачы ўжо аб «Жаках», як аб усім трэцім саслоўі.

Усё сваё выдатнае жыццё прысвяціў Дзідро таму, каб «Жакі» — трэцяе саслоўе — грозна заявілі аб сваім праве на жыццё і ўзняліся на штурм феадальнай манархіі. Яго барацьба за рэалізм, за дэмакратычнае мастацтва, барацьба за матэрыялізм супроць феадалізма, рэлігіі і іншых прыгнятальнікаў народа — вылучаюць Дзідро ў першыя рады выдатных змагароў за лепшае будучае прагрэсіўнага чалавецтва.

[1]) Энгельс «Анты-дзюрынг», стар. 11. Партвыдат, 1934.

[2]) «Пабочны сын» — драма Дзідро.

Нам. адказнага рэдактара А. Р. ВАРАШЫЛАЎ.

Друкарня «Звязда». Газета выходзіць раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Уп. Галоўлітбела № Б—5711.